Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: Іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапаровай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапаровай пасьлядок тэксту 1 р. — к. За радок шапаровай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьяш тарыфу бярэцца 10 проц. пазлту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 139 (2327) Аўторак, 19-га чэрвеня 1928 г.

Патрэбна гарантыя не на словах, а на справе.

Нота народнага камісара па замежных справах т. Чычэрына польскаму пасланьніку ў Маскве п. Патэку, якую мы сёньня друкуем, выклікана тымі высуненымі адносінамі польскага ўраду да сваіх «уверений» і «заверений» у дружбе з Савецкім Саюзам у нахаваньні надалей нармальных польска-савецкіх адносін.

Справа ў тым, што польскі ўрад хацеў даць ясны адказ на пытаньні, ці гарантуе Польшча на далейшы час забясьпеку прадстаўнікам Савецкага Саюзу ў Польшчы ад нападу расейскай белагвардзейшчыны, якая вяла там свае гнёзды і над тым ці іншым флагам актыўна дзейнічае і па сёньняшні дзень.

Забойствы нашых прадстаўнікоў, пакушэньні на іх, можна сьмела сказаць, буць мець мейсца і надалей пры той палітыцы да белай эміграшчыны польскага ўраду, якая праводзіцца зараз. Польскі ўрад у сваіх нотах, толькі на словах абяцае спыніць белагвардзейскі тэрор, унаць раз'юшаную эміграшчыну, а на справе нічога ня зроблена.

Сягоньня на волі разгульвае той, хто пакушаўся на нашага торгпрэда, польскі суд чамусьці шукае „закопу“, каб апраўдаць віноўнікаў злачынага замаху, польская прэса, нават блізка стаячая да афіцыяльных польскіх сфэр, друкуе артыкулы ў абарону белагвардзейскіх злачынцаў. У гэты-ж час мы назіраем і той факт, што ярыя ворагі Савецкага Саюзу—ідэолёгі белагвардзейшчыны — выступаюць публічна з манархічнымі прамовамі, заклікаючы эміграцыю арганізавацца і праводзіць адкрыта анцісавецкую акцыю.

Як можна назваць такую палітыку польскага ўраду, які некалькі разоў у сваіх нотах, здавалась-бы шчыра, заяўляў, што прыме самыя энэргічныя крокі на толькі пакараць вінаватых у забойствах і нападах, але падобныя акты зрабіць немагчымымі ў далейшым?

Савецкі ўрад, думка якога выказана ў ноце т. Чычэрына, заўсёды імкнуўся і зараз імкнецца і робіць усё магчымае захаваць добрасуседзкія адносіны з Польшчай. І гэта ёсьць ня толькі словы, гэта ёсьць тая рэальная палітыка, якую савецкі ўрад увесь час праводзіць у адносінах да Польшчы. Вось чаму савецкі ўрад так настойчыва патрабуе ад польскага ўраду рэальнай гарантыі, каб мець асноўную прадпасылку для нармальных польска-савецкіх адносін. Савецкі ўрад на гэта пытаньне чакае яснага адказу, чакае рэальных крокаў польскага ўраду ў адносінах да махровай белагвардзейшчыны, якая сваімі бандыцкімі ўчынкамі, сваім тэрорам падрывае нармальныя адносіны паміж Польшчай і Савецкім Саюзам.

Нам думаецца, што як польскі ўрад, так і ўся польская грамадзкасьць зацікаўлена ў хутчэйшым вырашэньні гэтага пытаньня, зацікаўлены ў тым, каб адносіны паміж Польшчаю і Савецкім Саюзам былі самыя добрасуседзкія. І той, хто імкнецца парушыць гэтыя адносіны, павінен быць пакараны, такім элементам не павінна быць мейсца ў дзяржаве.

Савецкая грамадзкасьць надзвычайна чула рэагавала на ўсе белагвардзейскія ўчынкі ў Польшчы. Стотысячныя мітынгі гарачага пратэсту і абурэньня адбываліся пасьля забойства Войкава, пасьля пакушэньня на Лізарава. Савецкая грамадзкасьць неспакойна і зараз за лёс савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы, неспакойна будзе да тых часоў, пакуль польскі ўрад ня дасьць рэальнай гарантыі, поўнай забясьпекі нашым прадстаўнікам ад бандыцкіх рук белагвардзейшчыны.

Пры вырашэньні гэтага пытаньня толькі канкрэтныя меры з боку польскага ўраду, толькі шчыры і сур'ёзны падыход да гэтай справы паслужаць надзейнай гарантыяй нармальных і здаровых польска-савецкіх адносін.

Гэтай гарантыі мы і чакаем.

Хікс і Томас не абдураць рабочую клясу.

АНГЕЛЬСКАЯ КАМПАРТЫЯ ВЫКРЫВАЕ СУТНАСЬЦЬ ПАЛІЦЭЙСКАГА ТРУКА „АБ РАСЕЙСКІМ УМЕШВАНЬНІ“.

ЛЁНДАН, 14-6. Ангельская кампартыя выясніла ў сваім органе «Уоркер Лайф» шэраг наконт выступленьня Хікса.

«Абвінавачаньні, высунутыя проці савецкіх устаноў у Лёндане,—гаворыцца ў газэце,—пацярпелі поўны крах. Абвінавачаньні проці савецкіх устаноў былі набудаваны выключна на даносах паліцэйскіх агентаў. Толькі ўпартая і злонамераная кампанія, з мэтаю зламаць манапалію савецкага замежнага гандлю—у першую чаргу, а ў канчатковым выніку падрыхтаваць грамадзкую думку да новае вайны проці першае сацыялістычнае рэспублікі, магла штурхнуць кансерватыўны ўрад да такога выступленьня. У гэтым міністэрству ўнутраных спраў дапамагалі выпады проці Савецкага Саюзу з боку т. зв. рабочых лідэраў. Наадварот, іменна савецкі ўрад меў-бы права скардзіцца на фінансуемую прапаганду і тэрарыстычную дзейнасьць накіраваныя проці яго.

Адозва прыводзіць безьліч выпадкаў, калі ангельскі ўрад афіцыйна падтрымліваючы мірныя дачыненьні з СССР, дапамагаў дзейнасьці накіраванай проці савецкага ўраду.

Камуністычная партыя, гаворыцца далей у адозве,—папераджае рабочых і зазначае, што ўсе размовы з боку кансерватараў, лібэралаў і г. зв. рабочых лідэраў „аб расейскім умешваньні“ яўляюць сабою толькі трук для таго, каб адцягнуць увагу ад злачыннае дзейнасьці, накіраванае проці савецкага ўраду“.

Закранаючы далей аб'яднаньня захады Джойнсона Хікса і Тамаса ў палаце вобшчык паварнуць усю справу ў мэтах кампаніі проці камуністычнае партыі, адозва падкрэсьлівае, што камуністычная партыя ня бачыць заганы для сабе ў тым, што яна зьяўляецца сэкцыяй Камінтэрну, г. зн., сапраўднай міжнароднай асацыяцыяй працоўных. Камуністычная партыя лічыць што гэта дае ёй магчымасьць толькі ганарыцца, а не сароміцца. Камуністычная партыя заяўляе катагарычна, што яна і ў далейшым намерана падтрымліваць і разьвіваць свае дачыненьні з Камуністычнымі Інтэрнацыяналам і братэрскімі партыямі заграніцаю.

НАЖЫМ СІТРЫНА НА ВОЛЮ ГАРНЯКОУ.

ІМКНЕНЬНЕ ПАЗБАВІЦЦА АД КУКА.

ЛЁНДАН. «Сэндэй Уоркер» (орган левага крыла прафсаюзнага руху) паведамляе, што генэральная рада трэд'юніёнаў ужыла неафіцыйныя крокі, з мэтаю дамагчыся, каб выканаўчы камітэт прафэсыянальнага саюзу горнарабочых адмовіўся назначыць Артура Кука сваім прадстаўніком у генэральную раду на той год.

СТАЧКА ЛЯНКАШЫРСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ.

ЛЁНДАН, 16-6. У Лянкашыры і Йоркшыры забаставала 5000 тэкстыльшчыкаў, якія патрабуюць падвышкі заработку для падзённых рабочых.

Англія купіла Бэнеша.

АНТЫСАВЕЦКІ НАПРАМАК ЗАМ. ПАЛІТЫКІ ЧЭХАСЛАВАКІІ.

ПРАГА, 14-УІ. На думку палітычных колаў пасьля падарожжа Бэнеша ў Лёндан анґельская арыентацыя замежнае палітыкі Чэхаславакіі робіцца ўсё больш адкрытаю. Аб гэтым сьведчыць пазіцыя газэт, блізкіх да Бэнеша, пры абмеркаваньні польска-літоўскіх спрэчак. Абедзьве гэтыя газэты перайшлі зусім адкрыта на бок Польшчы.

Дэпутат кампартыі Болен на пасяджэньні парляманту так характарызаваў палітыку Бэнеша: «Бэнеш у сваім дакладзе наконт замежнае палітыкі заявіў, што замежная палітыка Чэхаславакіі тая-ж самая, што і палітыка драпежніцкае Англіі, г. зн. палітыка, якая мае на мэце аб'яднаць капіталістычныя дзяржавы Эўропы для барацьбы проці СССР. У момант, калі ангельскія імпэрыя пачынае эканамічна і палітычна распадацца, Чэхаславакія замест перагляду сваёй замежнай палітыкі, адкрыта переходзіць у процісавецкі лягер.

Удар па грэцкім гандлі з СССР.

МАСКВА, 16-6. З Атэн паведамляюць, што грэцкая палата адхіліла праект гандлёвае згоды між СССР і Грэцыяй.

Гандлёвыя зносіны СССР з Грэцыяй пачаліся ў чэрвені 1924 г., калі ў Атэнах было адчынена савецкае гандлёвае прадстаўніцтва. Ужо ў чарговым годзе гандлёвага абароту СССР з Грэцыяй дасягнуў 4,8 мільёнаў руб. У 1925-26 г. ён складаў 5,95 мільёнаў руб., а ў 1926-27 г. ён дасягнуў да 7,2 мільёнаў руб. Праўда, наш экспорт у Грэцыю значна перавышае наш увоз з гэтага краю, але пасыўнасьць грэцкага балянсу замежнага гандлю характарызуе ўвесь замежны гандаль Грэцыі.

Нота тав. Чычэрына Польшчы

СССР не задаволен мерапрыёмствамі, ужытымі польскім урадам у абарону савецкага пасольства.

Пратрэбны сур'ёзныя і рашучыя меры проці белаэміграцыі.

16-га чэрвеня, член калегіі Народнага Камісарыяту па Замежных Справах т. Стаманякоў перадаў польскаму пасланьніку ў Маскве Патэку ноту Народнага Камісара па Замежных Справах т. Чычэрына, у якой гаворыцца:

Пан. міністр!

У сваёй ноце ад 7-га мая я зьвярнуў вашую ўвагу на тое, што адсутнасьць гарантый бесапаснасьці паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве становіцца фактам, які стварае пагрозу дачыненьням між СССР і Польшчаю. У зьвязку з такім становішчам, Саюзны ўрад спадзяваўся, што польскі ўрад сьпешна паведаміць яго аб ужытых ім захадах, якія павінны былі канчаткова і сапраўды зьнішчыць тэрарыстычную дзейнасьць белае эміграцыі ў Польшчы.

З вашае ноты ад 3-га чэрвеня Саюзны ўрад мяркуе, што польскі ўрад лічыць, што, каб зьнішчыць ненармальнае становішча, досыць урадавага папярэджаньня, якое ён зрабіў белай эміграцыі ў сваёй абвестцы ад 14-га жніўня 1927 г. Аднак меры польскага ўраду, ужытыя на аснове гэтага факту, зьявіліся зусім нездавальняючымі для спыненьня тэрарыстычнае дзейнасьці белаэміграцкіх арганізацый. Пацьверджаньнем гэтага зьяўляецца апошні замах 3-га мая г.г.

Саюзны ўрад ня можа таксама прызнаць здавальняючымі тых мер, якія былі ўжыты польскім урадам пасьля замаху Вайцахоўскага. У сваёй ноце ад 3-га чэрвеня вы спасылаліся на шэраг арыштаў, учыненых пасьля гэтага замаху. Між тым, за апошні час усе асобы, арыштаваныя ў зьвязку з замахам 3-га мая, ужо вызвалены. Такія мерапрыёмствы, даючы толькі часовы эфэкт, наўрад ці здольны зрабіць належны ўплыў на злачынныя колы белае эміграцыі ў Польшчы.

Саюзны ўрад сьцьвярджае, што для забясьпечаньня бесапаснасьці паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР і абароны дачыненьняў між СССР і Польшчаю ад бязупынных устрасак павінны ўжыць больш сур'ёзныя меры. Паколькі польскі ўрад, як вы паведамляеце ў вашай ноце ад 3-га чэрвеня, ужываў і намеран ужыць крокі, каб «зрабіць немагчымымі ў будучым» тэрарыстычныя акты проці паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР, Саюзны ўрад будзе чакаць паведамленьняў аб канкрэтных мерах польскага ўраду.

Пакуль ня будуць ужыты польскім урадам новыя сур'ёзныя і рашучыя меры проці белае эміграцыі, датуль Саюзны ўрад ня можа лічыць станоўча вырашаным пытаньне, высунутае маёй нотай ад 7-га мая г. г. і ўскладае на польскі ўрад адказнасьць за бесапаснасьць паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве.

Прымеце, пан міністр, мае завярэньні ў высокай да вас пашане.

Нарком па Замежных Справах ЧЫЧЭРЫН.

Мала адных завярэньняў.

(З перадавіцы „Правды“).

„Правда“ ў перадавіцы пад загалоўкам „Патрэбны не завярэньні, а сур'ёзныя меры“ піша:

У ноце Чычэрына Патэку выяўлен пункт гледжаньня нашага ўраду на сучаснае становішча польска-савецкіх дачыненьняў у зьвязку з адсутнасьцю належных гарантый і мер з боку польскага ўраду, які да гэтае пары «церпіць» на сваёй тэрыторыі злачынную дзейнасьць белагвардзейскага зброду.

Мы з поўным правам можам сьцьвердзіць, што мінімальна неабходных фактычных мер проці белатэрарыстаў Польшча да гэтага часу ня ўжывала. І тыя «меры», на якія зазначае ў сваёй ноце Патэк, зьяўляюцца, зразумела, толькі пустою адпіскаю ад сутнасьці пытаньня.

Таму з поўным правам мы можам і павінны ўскладаць адказнасьць за магчымыя здарыцца ў далейшым ускладненьні ўласна на ўрад Польшчы. На яго ўскладаецца простая адказнасьць за бесапаснасьць паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Варшаве.

Разрадзіць атмасфэру, наладзіць дачыненьні да лепшага—гаворыцца далей у перадавіцы,—залежыць цяпер выключна ад польскага ўраду. Калі ён сапраўды ў гэтым зацікаўлены—ён завяраў нас у гэтым шмат разоў—дык ён можа і абавязан узяцца сур'ёзна за выкананьне сваіх элементарных абавязацельстваў.

Да гэтага часу «мерамі» Польшчы была адсутнасьць усякіх мер. Сьмешна спасылацца на ізыраішэньні Польшчы ад 14-га жніўня 1927 г., пасьля якіх мы былі сьведкамі шэрагу тэрарыстычных актаў. Ужо зусім недапусьцімым належыць лічыць вызваленьне арыштаваных у зьвязку з замахам Вайцахоўскага. Ці-ж можна разглядаць вызваленьне арганізатараў замаху і правінных у ім іначай, як ня сыгнал „валяйце яшчэ, мы вас ня будзем караць“?

Завярэньні Патэка ў ноце, зразумела, ні ў якім выпадку ня могуць нас колькі-небудзь задаволіць. Ад польскага ўраду мы патрабуем і чакаем сапраўдных мер, мер сур'ёзных і цалком канкрэтных.

Арыентацыя Фын-Юй-сяна на Японію.

ШАНХАЙ, 16-6. Водлуг загаду нанкінскага ўраду, войска Фын-Юй-сяна адышло ад ваколіц Пекіну.

Як паведамляе агэнцтва Рэйтара, Фын-Юй-сян запрасіў загадчыка кітайскага аддзелу японскага генэральнага штабу Мацумара на пасаду свайго дарадчыка.

ЯПОНЦЫ НАВЯЗВАЮЦЬ СВАЮ ВОЛЮ.

ПЕКІН, 16-УІ. Кітайская частка мешанае кітайска-японскае камісіі для расьсьледваньня прычын выбуху ў поезьдзе Чжан-Цзо-Ліна адмовілася падпісаць пратакол, прапанаваны японскаю часткаю. У пратаколе якраз вымешчана вядомае японскае зазначэньне, што выбух поезду арганізован «агентамі паўдзёўцаў».

НАНКІНСКАЯ ДЭКЛЯРАЦЫЯ АБ ЗАМЕЖНАЙ ПАЛІТЫЦЫ.

ШАНХАЙ, 16-УІ. Нанкінскі ўрад агаласіў дэкларацыю наконт сваёй замежнай палітыкі. У дэкларацыі, між іншым, зазначана: «Мы лічым, што надышоў час распачаць перамовы наконт новых угавораў, на аснове поўнае роўнасьці і ўзаемнае павагі да суверэнітэту абодных краёў».

ГАМІНДАНАЎСКІ СЬЦЯГ НАД ПЕКІНСКІМ ПАСОЛЬСТВАМ У ТОКІЁ.

ТОКІЕ, 16-6. Кітайская місія ў Токіё узьняла Гаміндаўскі сьцяг.

ПАЎСТАНЬНЕ ЧЫРВОНЫХ ПІК ПРОЦІ ФЫНА.

ШАНХАЙ, 16-6. У Сяцзіньшэні на паўночным захадзе ад Цзынані (у правінцыі Шандунь) чырвоныя пікі, нездаволеныя непамернымі падаткамі, увядзенымі Фын-Юй-Сянам, напалі на бюро па збору падаткаў, зруйнавалі яго і забілі 20 чыноўнікаў.

На адшуканьне Нобіле.

ОСЛО, 17-6. Нарвэскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе з Кінзбэю (Шпіцбэрген): «У Кінзбэй варочаецца «Хобі», які адтуль паплыве ў Нарвэгію. У далейшым росшукі Нобіле будуць рабіць параход «Браганца» і два нарвэскіх самалёты.

Паведамленьні чужаземнага друку, нібыта «Хобі» знайшоў трох удзельнікаў экспэдыцыі Нобіле, якія ішлі ў напрамку на Кінзбэй, ня маюць ніякае падставы».

АВАРЫЯ САМАЛЁТУ МАДАЛЕНА.

ОСЛО, 16-6. Апарат італьянскага лётчыка Мадалена, які накіраваўся на дапамогу Нобіле, пацярпеў аварыю ў Варангер-фіёрдзе і адведзен на бунсіры назад у Вадсэ.

ФІНСКІ САМАЛЁТ НА АДШУКАНЬНЕ НОБІЛЕ.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 16-6. Абставляваны фінскім урадам для падачы дапамогі экспэдыцыі Нобіле самалёт «Турку» выляцеў 15-га чэрвеня з Гэльсінгфорсу і прыбыў у Вазу, накіроўваючыся ў Шпіцбэрген.

АМУДСЭН ЛЯЦІЦЬ НА АДШУКАНЬНЕ НОБІЛЕ.

ОСЛО. Францускі аэраплян, кіруемы францускія лётчыкам майёрам Гільбо, прыбыў у Бэрген. Гільбо супольна з Амудсэнам намераны 17-га чэрвеня выляцець на Шпіцбэрген.

ПРЫДУШЭНЬНЕ МАКЕДОНСКАЕ СТАЧКІ

ВЕНА, 16-УІ. З Атэн паведамляюць, што 14-га чэрвеня ў Салоніках конная паліцыя наскочыла на сход рабочых тытунёвых фабрык. Шмат рабочых паранена.

У Салоніках і іншых гарадох, ахопленых забастоўкаю, усе грамадзкія памяшканьні і вуліцы заняты войскам. Дэманстрацыі заборонены. Арышты набываюць масавы характар.

Нямецка-літоўскія гандлёвыя перамовы.

14 чэрвеня ў Коўню прыехала нямецкая гандлёвая дэлегацыя для абгавору гандлёвых пытаньняў.

НЯЎДАЧЫ МЮЛЬЛЕРА.

БЭРЛІН, 16-УІ. Пасяджэньні рэйхстагу спынены да заснаваньня новага ўраду. Перамовы Мюльлера з лідэрамі фракцый не пасоўваюцца. Правы друк намякае, што ў выпадку далейшае зацяжкі Гіндэнбург паспрабуе паскорыць стварэньне ўраду.

АГУЛЬНЫ ПЕРАПІС У КРАЁХ ПРЫБАЛТЫКІ.

На пядаўняй аб'яднанай статыстычнай канфэрэнцыі Літвы, Латвіі і Эстоніі пастаноўлена весьці падрыхтоўчую працу да агульнага перапісу, які павінен адбыцца ў 1930 г. альбо ў 1931 г. ва ўсіх гэтых 3-х дзяржавах адначасова.

У ПОЛЬШЧЫ.

ЯЎРЭЙСКАЯ ФРАКЦЫЯ Ў СОЙМЕ ГУЛЯЕ Ў АПАЗІЦЫЮ.

У апошнія дні ў яўрэйскай соймавай фракцыі адбыліся перавыбары старшыні фракцыі. За старшыню абраны вядомы яўрэйскі дзеяч і вязьмены депутат у Сойме —Грынбаум.

Гэтыя выбары зьвярнулі на сябе ў вагу палітычных колаў Польшчы і тлумачацца, як «пераход да вострае апазіцыі».

Такім чынам польскія буржуазныя яўрэйскія групоўкі пад важкім выбаршчыкаў „перакаваліся“ яшчэ адзін раз (каторы толькі?), што ўсе абяцанкі афіцыйных прадстаўнікоў ураду аб якіх-небудзь палёгках і заканамернасьці адносна яўрэйскае нацменшасьці,—зьяўляюцца звычайнымі панскімі «цацанкамі абацанкамі» і могуць цешыць паводле гэтай-жа пагаворкі, толькі дурняў. Аднак, гэта ня значыць, што клясавыя інтарэсы фракцыі ня штурхнуць яе заўтра ізноў у абыймы пілсудчыны.

ЗАБАСТОЎКА ПЯЧНІКОЎ.

У Варшаве ўжо 6 тыдняў цягнецца забастоўка пачнікоў, якія жадаюць падвышкі расцэнкі іх працы на 50 проц. Прэдпрыемцы ўгаджаюцца толькі на 15 проц. падвышкі платы.

АГІТАЦЫЙНЫ ПАЛЁТ ПОЛЬСКІХ САМАЛЁТАЎ.

12 чэрвеня, з Варшавы вылецела эскадрылья з трох вайсковых самалётаў пад кіраўніцтвам начальніка вайсковае авіяцыі палкоўніка Райскага. Маршрут эскадрыльі наступны: Бухарэст, Белград, Сафія, Канстантынопаль і Ангора. У кожнай з гэтых гарадох самалёты будуць затрымліваецца. Лёт эскадрыльі прадоўжыцца каля 2-х тыдняў.

У сучасны момант эскадра прыляцела ў г. Бухарэст.

СТЫХІЙНЫЯ НЯШЧАСЬЦІ.

15 чэрвеня над тэрыторыяй Віленшчыны прайшла вялізная бура з парунамі і навальніцаю. Было некалькі выпадкаў пажараў і сьмерці ад паруна. Зьнішчаны шэраг маёмасьцей і значна папсавана шмат дарог. Асабліва шкоды нанесла бура засевам і лясом. У вёсцы Прялае ад паруна згарала 56 хат.

У Галіцыі бура з навальніцаю і парунамі нанесла таксама вялізныя шкоды. У г. Стрый ад паруна згарэлі чыгуначныя майстарні.

САМАГУБСТВЫ ЖАЎНЕРАЎ У ПОЛЬСКАЙ АРМІІ.

Польскія газэты адзначаюць шэраг выпадкаў самагубства сярод жаўнераў польскае арміі. Пэўная частка самагубстваў прыпадае на жаўнераў-яўрэяў. Вядома, што антысэмітызм у арміі прымае самыя агідныя формы. Ня будучы ў стане вытрымаць зьдзекаў, жаўнеры-яўрэі канчаюць жыцьцё самагубствам. Апошні такі выпадак меў месца пару дзён назад у Саколцы Беластоцкага ваяводзтва.

Радыёсувязь Канады з Аўстраліяй.

ЛЁНДАН, 15-УІ. Пачаліся радыётэлеграфныя зносіны між Канадаю і Аўстраліяй; апараты працуюць на кароткіх хвалях водлуг прапанаванага Марконі прынцыпу накіраванае сілы «пучкоае» хвалі.

Падрыхтоўка да VI кангрэсу Камінтэрну

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта).

Сэкратар Камінтэрну тав. Эмбэрдро паведаміў нашаму маскоўскаму карэспандэнту наступныя весткі аб папярэдняй працы на скліканьню VI Кангрэсу, якая адбываецца ў Камінтэрне.

Спэцыяльная камісія ў складзе т. т. Бухарына, Сталіна, Эмбэрдро, Куусынена, Ромэле, Кярэ Цэткін, Таньгейміра, Пэйдж Арнота, Тамаса, Бела, Барбэ, Пурмана, Энгдала, Эрколі і Горкіча, якая выпрацавала праект праграмы Камінтэрну агалошаны на чатырох мовах у часопісі «Камуністычны Інтэрнацыянал», у сучасны момант занята арганізацыяй тэарытычнай дыскусіі па ўсіх пытаньнях, закранутых праэктам. Усе папраўкі і прапановы наконт праэкту, якія будуць унесены асобнымі секцыямі Камінтэрну, будуць апрацаваны гэтай камісіяй і паданы да ведама Кангрэсу, які разгледзіць новую камісію для ўстанаўленьня канчатковага тэксту праграмы.

Другая камісія пад старшынствам члена ЦК ангельскай кампартыі т. Таннера Бэла распачала падрыхтоўку тэзісаў аб небяспецы вайны і прапрацоўцы матэрыялаў аб ролі сацыял-дэмакратыі ў ваенных падрыхтаваньнях міжнароднага імперыялізму. Выніні працы гэтай камісіі будуць выданы напярэдадні Кангрэсу ў выглядзе асобнай книжкі.

Трэцяя калёніяльная камісія пад кіраўніцтвам тав. Куусынена таксама гэтымі днямі распачне працу.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ДА ТЫДНЮ АБАРОНЫ.

(Гутарка з Нам. Старшыні Рэвваенсавету тав. Каменевым).

У гутарцы з нашым маскоўскім карэспандэнтам тав. Каменеў сказаў:

Надыходзячы «Тыдзень Абароны»—важнейшы этап на шляху ўмацненьня абароназдольнасьці нашага Саюзу. У гэты «Тыдзень» нам трэба зрабіць вялізную і адказную працу. Нам трэба падагуліць вынікі пяцігадовай працы ў справе мабілізацыі грамадзкай думкі, у справе барацьбы за лепшую абароназдольнасьць нашай краіны.

Мы думаем, што значэньне надыходзячага «Тыдню» зразумела і блізка ўсім працоўным. А гэта ў значнай меры гарантуе посьпех надыходзячага „Тыдню“.

Справа падрыхтоўкі мас да абароны—справа сур'ёзная, справа вялікая. У працягу надыходзячых 7 дзён працоўныя Савецкага Саюзу будуць дэманстраваць сваю абароназдольнасьць. Гэтую дэманстрацыю маскоўская моладзь ужо распачала, намеціўшы шэраг ваенных выхадаў сваіх баявых атрадаў.

У часе гэтых выхадаў у нас будзе поўная магчымасьць пераканацца ў сваіх дасягненьнях, заўважыць дапушчаныя памылкі.

Выхад у поле—дасканалы мэтад праверкі нашай працы.

«Тыдзень» павінен быць тыднем мабілізацыі гатоўнасьці нашай грамадзкасьці, «Тыдзень» павінен быць праведзен пад лёзунгам—падрыхтоўкі да абароны.

Ліквідацыя вынікаў шкодніцтва на Данбасе.

ХАРКАЎ. 18-6. На ўсеукраінскай вытворчай канфэрэнцыі саюзу горнарабочых, скліканай каб абмеркаваць пасьпяўныя пытаньні вугольнае прамысловасьці, у дакладзе пакопт становішча працы ў камена-вугольнай прамысловасьці Данбасу старшыня ўправы Допвугалю т. Ломаў, між іншым, зазначыў:

„Шахцінская справа зьяўляецца для ўсіх нас добраю навукаю, якая павінна добра запасьці ў памяць, каб ні шкодніцтву ні мімавольным памылкам не магло быць месца. Як вядома, шкоднікі ўсю сваю ўвагу згуртоўвалі на будаўніцтве новага Данбасу, на пракладцы новых капальняў. З гэтае прычыны мы зараз перагледзем усё праэкты новых капальняў, якія ўжо былі зацьверджаны раней. Гэтыя праэкты будуць прапушчаны праз сіта рабочае крытыкі, бо толькі гэта можа пазбавіць нас ад памылак. З другога боку, на падставе даных працэсу па шахцінскай справе, мы абсьледуем усе капальні, затопленыя раней з мэтамі шкодніцтва. Магчыма, што адна-ю паваць старыя капальні будзе выгадней і эканамічна больш мэтазгодна, чымся закладаць новыя».

Нарэшце т. Ломаў заклікаў рабочых на данамогу трэсту як мага хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцкае працы на Данбасе.

Неабходна выканаць дырэктыву.

МАСКВА. 18-5. У звароце НК РСІ СССР і Наркамфіну СССР да ўсіх органаў Рабоча-Сялянскае Інспекцыі і дзяржаўнага фінансавага кантролю вазначана: праверка выкананьня педамствамі і ўстановамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах, дырэктывы ўраду аб 20-ці процантным скарачэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў зьяўляецца адною з чарговых і самых важных задач Рабоча-Сялянскае Інспекцыі і дзяржаўнага фінансавага кантролю. Між тым, з надасланых справаздач відаць, што некаторыя органы РСІ і дзяржаўнага фінансавага кантролю ня так правільна разумеюць свае задачы ў кампаніі па пуваротку зьніжэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў і часта абмежоўваюцца зазначэньнем на факт невыкананьня дырэктывы ўраду з адпавядаю асобных выпадкаў парушэньня бюджэтнае дысцыпліны.

НК РСІ СССР і Наркамфін Саюзу ССР заклікаюць органы РСІ і дзяржаўнага фінансавага кантролю выявіць максімум актыўнасьці ў ажыцьцяўленьні гэтае задачы, прыцягваючы ўсімі мерамі да ўдзелу ў працы шырокія масы грамадзкасьці.

Сялянская калектывізацыя ў РСФСР.

МАСКВА, 16-6. Водлуг папоўных даных наркамзему РСФСР, з 1 кастрычніка да 1 мая гэтага году заснавана 25 тысяч новых сялянскіх аб'яднаньняў.

Побач з арганізацыяй практычных аб'яднаньняў наглядаецца таксама рост больш складаных калектыўных форм, г. зн. сельска-гаспадарчых хаўрусаў, камун і інш.

Усяго на 1 мая ў РСФСР налічвалася 56161 сялянскіх аб'яднаньняў, з іх: сел.-гас. калектываў—10751, аб'яднаньняў пасеўшчыкаў—4565, машынных т-ваў—12061, пасеннаводных т-ваў—1864 і г. д. На першых месцы па колькасьці аб'яднаньняў стаіць Сібір, дзе іх налічваецца звыш 10 тысяч, на другім месцы Каўказ—8260.

15.000 новых трактараў.

МАСКВА, 16-6. Дзеля найбольшага ўмацненьня тэмпу мэханізацыі сельскае гаспадаркі, Савет Працы і Абароны прапанаваў камітэту па пагодженьні дастаўкі сельскай гаспадарцы машын, прадугледзіць, складаючы пляны дастаўкі трактараў на 1928-29 г., агульнае наступленьне ў сельскую гаспадарку ня менш 15000 новых трактараў з адпаведнаю колькасьцю запасных частак і прыцэпнага інвэнтару. НК гандлю дадзен загад, каб у 1928-29 г. завоз трактараў, прызначаных для веснавое кампаніі, быў ажыцьцёўлен не пазьней сярэдзіны другога кварталу, а завоз трактараў для асеньняе кампаніі—не пазьней сярэдзіны трэцяга кварталу.

Першы зорачны пералёт 1928 г.

МАСКВА, 18-6. 17 чэрвеня аўбыўся першы зорачны пералёт 1928 году. У пералёце ўзяло ўдзел 19 самалётаў. З 19-ці самалётаў, якія вылецелі ў Маскву з 9-ці пунктаў, 16 самалётаў прылецела своечасна. З прычыны мясцовыя ня надыходзячага надвор'я з самалёты зрабілі вынужную пасадку.

Першым прыляцеў апарат з Сестрарэцку (16 гадзін. 55 хв.) з лётчыкам т. Пуразіеам . наглядальнем т. Сокалавым. Апарат пакрыў адлегласьць у 150 кілёмэтраў у працягу 3-х гадзін, 50 хв. Другі самалёт прыляцеў у 17 гадзін з Барбуйоку, потым з Дрэтуні і г. д.

Пасьля зьлёту самалётаў адбыўся мітынг, на якім выступіў т. Уншліхт, адзначыўшы, што маладыя савецкія лётчыкі выпуску 1927 г. і 1928 г. дасканала выканалі сваю задачу.

За лепшае дасягненьне ўдзельнікі пералёту будуць узнагароджаны 5 прэміямі.

Ранейшыя фабрыканты ў праўленьні трэсту.

УЛАДЗІМІР, 18-6. Бюро губкому ўсеКП(б) прапанавала старшыні праўленьня Мясьнікоўска-Мурамскага льнянога трэсту правесьці чыстку асабовага складу. У праўленьні трэсту працуе шмат ранейшых ўласьнікаў фабрык. Пра непадзейны склад праўленьня трэсту і пра безгаспадарчасьць, якая дапушчаецца гэтымі прапанайкамі, ня раз пісалі і ў газэтах ня толькі раборы, але і спэцыялісты. На гэтыя выкрыцьці праўленьне трэсту адпісавалася, заяўляючы, што выкрыцьці паходзяць ад «наіўных журналістаў».

Богаўгодны старшыня.

ВЯТКА, 18-6. Пра абураючы факт паведамляюць з Юмскае волаcьці, Кацельніцкага павету. 22 мая ў Юмскую волаcьць павінен быў «прыйсьці» абраз «Міколы цудатворцы». Старшыня валаснога выканкому Шамшурын захацеў адзначыць гэты «ўрачысты дзень» і загадаў спыніць на 22 мая заняткі ў валвыканкоме, а замест гэтага дню адпрацаваць дзень якога-небудзь «пралетарскага сьвята». Прыходзіўшыя на справах у выканком сяляне прымушаны былі вярочацца назад.

Шамшурын прыцягнут да адказнасьці.

Аманула-хан у Пэрсіі.

АД'ЕЗД У ТЭГЕРАН.

ТЭГЕРАН, 16-УІ. Аўганскі падышах з сям'ёю і са сьвітаю выехаў у Мешэд, адкуль праз Герат накіруецца ў Кабул. У дзень выезду падышах прыняў на развітаньні прыкамандыраваных да яго савецкім урадам загадчыка пратакольнае часткі НК на Замежных Справах т. Флёрынскім і камандзіра дывізіі т. Рымка.

УДЗЯЧНАСЬЦЬ УРАДУ СССР АД АМАНУЛЫ-ХАНА.

ТЭГЕРАН, 16-УІ. Аўганскі падышах і яго сьвіта ў гутарках з паўнамоцным прадстаўніком СССР у Пэрсіі т. Даўцаным і прыкамандыраванымі да падышага

Непераможныя канкурэнты кулака

Існуюць два шляхі развіцьця сельскае гаспадаркі: шлях капіталістычны і шлях сацыялістычны.

Да рэвалюцыі наша вёска ішла па першым шляху. На адным баку вёскі былі невялікія групкі моцных кулакоў, на другім—вялізныя масы беднаты, стала папаўняемыя бяднеючымі серадняками. Маючы больш зямлі, улаючы больш удасканаленымі сельска-гаспадарчымі прыладамі, кулак пасьпяхова канкураваў з серадняком, руйнаваў яго і тым павялічваў кадры беднякоў.

Кастрычнікавая рэвалюцыя дапамагла вёсцы збочыць са старога шляху і ўказала ёй новы сацыялістычны шлях. Разьвіцьцё вёскі па гэтым шляху ідзе за кошт удушэньня кулака і ўзьняцьця эканамічнага дабрабыту ўсяе іншае масы сялянства. Але тэмп разьвіцьця вёскі па сацыялістычным шляху ідзе пакуль што параўнаўча павольна.

Як-жа паскорыць гэты тэмп? На гэта пытаньне партыя дала ясны і выразны адказ: адзіны выхад—у буйнай аграмаджанай сельскай гаспадарцы. Вопыт паказвае, што ў нашых умовах дробная гаспадарка заўсёды менш выгадная, чымся буйная. Маючы больш машын, лепш апрацоўваючы зямлю, вядучы сваю гаспадарку найбольш культурнымі мэтадамі, кулак зьбірае іншы раз ураджай у паўтара разы больш, чымся ў суседа серадняка ці беднака. Удой малака, ураджай і прыбытковасьць рабочага дню і шмат інш. залежыць ад магутнасьці гаспадаркі; яны нізкія ў бедняка, вышэйшыя—ў серадняка і яшчэ вышэй у кулака. Адгэтуль вывад—чым буйнейшая гаспадарка, тым яна выгаднейшая.

Калі буйная паасобная гаспадарка зьяўляецца больш высокай ступенью ў параўнаньні з паасобнай дробнай, дык аграмаджаная буйная гаспадарка яшчэ больш выгаднейшая чымся буйная паасобная. І калектыўныя гаспадаркі, камуны і суполкі зьяўляюцца магутнымі канкурэнтамі кулаку з яго буйнай гаспадаркай.

Камуны трацяць куды менш сіл і атрымліваюць куды больш ўраджай, чымся любая паасобная гаспадарка. У той час, як бядняк траціць на апрацоўку і пасеў аднае дзесяціны зямлі каля 16 з пал. дзён, серадняк больш 12 дзён, кулак—больш 11 дзён,—камуна траціць менш 8 дзён. Пры гэтым ураджайнасьць у камуны большая, чымся ўраджайнасьць у індывідуальных гаспадарках.

Прыбытковасьць суполак залежыць і ад формы аб'яднаньня. Чым больш складаная форма, чым яна вышэй, тым яна выгаднейшая. Калі таварыства выгаднейшае за паасобную гаспадарку, дык арцель выгаднейшая за таварыства, а камуна выгаднейшая і за таварыства і арцель.

Падтрымліваючы розным чынам цягу сялянства да калектывізацыі, паказваючы яму на прыкладзе выгоднасьць пераходу на больш складныя формы калектывізацыі, мы тым самым асаджваем кулака, які, бязумоўна, ня здолее вытрымаць канкурэнцыі з больш моцнай калектыўнай гаспадаркай.

П. П.

За лепшае вывучэньне замежнае тэхнікі.

Узьняцьце народнае гаспаларкі СССР на высокую тэхнічную ступень немагчыма без рацыянальнага выкарыстаньня сучаснае чужаземнае тэхнікі і арганізацыі выторчасьці.

Справа ня толькі ў тым, каб выбраць па каталёгу тое ці іншае чужаземнае абсталяваньне. Па горкаму вопыту мы ведаем, як, купляючы наўгад, мы купляем машыну, якою ня можам і ня ўмеем карыстацца. Трэба ўмець падабраць адпаведныя машыны для выкананьня пэўнае працы, а галоўнае, праверыць іх у працы заграніцаю да выдачы заказу і прыглядзецца, як на іх працуюць. Ня менш важна ўмець іх прымаць з фабрыкі, каб ухіліцца атрыманьня машын, неадпавядаючых умовам заказу. Адным словам, трэба ўмець складаць тэхнічныя ўмовы і сачыць за іх выкананьнем.

Будуючы новыя і пераабсталёўваючы існуючыя заводы, мы павінны вывучаць сучасныя мэтады працы. Ва ўсіх тых выпадках, калі мы сваімі сіламі ня можам вырашыць складаныя тэхнічныя задачы, неабходна карыстацца тэхнічнай дапамогай чужаземных фірмаў, пасылаць на лепшыя заводы нашых гаспадарцаў і спэцыялістаў, вывучаць навейшыя мэтады працы.

Практыка кажа, што практыкаваная да гэтага часу пасылка заграніцу савецкіх гаспадарцаў і спэцыялістаў давала добрыя вынікі толькі ў тых выпадках, калі гэтыя паездкі былі своечасова падрыхтаваны і добра прадуманы. Той, хто езьдзіць „галопам па Эўропе", нічога карыснага ні для сябе, ні для дяржавы не атрымае.

З другога боку, мы ведаем, якую вялікую карысьць мела савецкая нафтавая прамысловасьць ад доўгіх паездак па Эўропе і Амэрыцы ня толькі гаспадарцаў і спэцыялістаў, але і рабочых. Вялізныя дасягненьні савецкае нафтавае прамысловасьці, яе амэрыканізацыя шмат чым абавязаны правільнаму выкарыстаньню чужаземнага вопыту. Таксама вялікая камісія, якая папрацавала заграніцаю (галоўным чынам у Амэрыцы) над вывучэньнем сучасных працэсаў каляровае мэталюргіі, у прыватнасьці, над пытаньнем абагачэньня рудаў і заказаўшая шэраг праэктаў мэталюргічных установак і фабрык, прарабіла працу вялікае важнасьці, якая мае рашаючае значэньне для разьвіцьця савецкае каляровае мэталюргіі.

Арганізацыі, праэктуючыя новыя заводы, а таксама буйныя трэсты СССР, маюць спэцыяльныя дагаворы аб тэхнічнай дапамозе і знаходзяцца ў сталым непасрэдным кантакце з чужаземнай тэхнікай, стала пасылаючы сваіх інжынэраў на чужаземныя заводы.

Мы павінны выкарыстаць вопыт пасылкі заграніцу нашых гаспадарцаў і шырэй паставіць гэту справу.

Выдаткі на камандыроўкі зусім невялікія: за мінулы год было 500 камандыровак па ВСНГ СССР, выдаткі, якія не дасягглі і аднаго процанту новых укладаў у прамысловасьць, а прынесеная імі карысьць у шмат разоў перавышае гэту лічбу.

Лепшы мэтад барацьбы з нашай адсталасьцю—гэта вывучыць чужаземную практыку і атрымаць новыя зарады ведаў і энэргіі для таго, каб з карысьцю ўжыць іх для сацыялістычнага будаўніцтва.

Я. В.

Арышт румынскага прафдзеяча-рэвалюцыянэра.

ВЕНА, 10-6. У Тэмэшвары (Румынія) ізноў арыштован нядаўна вызвалены з астрогу старшыня рады ўнутраных прафсаюзаў Мюльлер.

На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Сельсавет—гаспадар вёскі.

Чэбатовіцкі сельсавет самы вялікі ва Ўраравіцкім раёне. Ён абслугоўвае 3 вёскі і 35 пасёлкаў. Гэты с.-с. добра зразумеў важнасьць пастаноў 15 вьезду партыі аб калектывізацыі вёскі і сумесна з парт'ячэйкай стараецца гэтыя мерапрыёмствы правесьці ў жыцьцё. А асабліва вялікую працу с.-савет праводзіў як у падрыхтоўчую кампанію да вясеньняй сяўбы, так і ў час самай сяўбы. Сельсаветам на пленуме былі распрацаваны практычныя мерапрыёмствы, якія поўнасьцю прайшлі ў жыцьцё. У выніку былі арганізаваны 3 машынныя т-вы, злучны пункт, малочная арцель. Перайшлі на шматпольне пасёлкі «Ленінскі», «Вульляная», «Чырвоны Курган» і іншыя з агульнаю плошчаю ў 850 гэктараў. Пашырана плошча пад травасевам на 20 проц., кораньплоды на—7 проц. тэхнічных культур на—12 проц. і зернавых—на 2 проц. Цяпер с-савет задаўся мэтай дабіцца поўнага каапэраваньня беднаты. Па яго ініцыятыве ў апошні час каапэравана каля 60 беднякоў спажывецкай і 45 сельска-гаспадарчай каапэрацыяй.

Амаль па ўсім с.-савеце праведзена земляўпарадкаваньне за выключэньнем в. «Зяляноўка» і «Будзішча», якіх сельсавет наважыў земляўпарадкаваць у гэтым годзе.

Культасьветная праца. На тэрыторыі с.-с. маюцца: 1 аднакамплектавая школа, 1—2-хкамплектавая, 1—3-х камплектавыя школы. У в. Чэбатовічах памяшканьне школы вельмі малое і неўмяшчае ўсіх вучняў. Сельсавет высяліў з дому папа, дзе цяпер працуе школа і хата-чытальня. К пачатку вучэбнага году с.-с. адбудавана яшчэ адна школа. У в. Чэбатовічы ўстаноўлена радыё з гучнагаварыцелем.

С.-савет таксама клапоціцца і аб дабрабыце вёсак: пабудаваны 3 масты і 4 грэблі. Цяпер прыступаюць да пабудовы 8 мастоў, і 9 грамаадводаў па самаабкладаньні.

Але разам з гэтымі дасягненьнямі маюцца і недахопы. Ня ўцягнуты ў працу с.-савету ўсе яго члены. Арганізаваныя сэкцыі пры сельсавеце працуюць толькі на паперы. Ніякай працы не вядзецца сярод жанчын. Мала клапоціцца с.-савет аб арганізацыі пажарнай дружыны, і пажарная машына ляжыць недзе ў пуні закінутая. Часам, калі здарыцца пажар, дык яна так і будзе ляжаць.

На гэтыя недахопы с.-с. трэба будзе зьвярнуць увагу.

Дзяніс Духвалаў.

Няма санітарнага нагляду.

Вуьядзенская спажывецкая каапэрацыя прадае сала і мяса. На гэтых прадуктах маецца клаймо і кожны лічыць, што мяса здаровае, а ў сапраўднасьці яно з крупчаком.

Калі запытаешся ў загадчыка крамы, чаму кепскае сала, дык пачуеш адказ: «калі-ж усе бяруць бо надта танна!».

Ці ня трэба было-б пазбавіць нашу каапэрацыю ад гэткай таннасьці?

ЯЗЬМІН.

ДАЧАКАЛІСЯ.

Земляробы Слуцкага прадмесьця Малая-Падзер, як і ўсе сяляне, плацяць сельска-гаспадарчы падатак.

Яшчэ ў верасьні 1927 году яны чакалі акладных лістоў. Прашоў і верасень і кастрычнік, а лістоў як ня было, так і няма.

— Што за ліха, думаюць яны, няўжо пра нас забылі?

Затурбаваліся сяляне і пашлі ў гарсавет а потым у фінінспэктуру. Там адказ.

«Даведайцеся ў РВК».

І там адказ:

— Пачакайце, прышлём.

Чакаюць дзень, другі. Чакаюць месяц, другі, трэці. Аб падатку ні слуху.

— Відаць, нас аслабанілі ад падатку,—надумаліся падзерцы і супакоіліся.

А тут аднаму вучню патрэбна была спраўка ў школу, колькі плаціць падатку бацька. Пайшоў у фінінспэктуру, а там адказваюць:

— Прыдзеце праз дзянькоў два-тры.

Прайшло і два дні, прайшло і два тыдні. Хлопец пахадзіў разоў са тры і плюнуў са злосьці і больш не пайшоў. Школа турбуе вучня, а той адказвае. «Няма ліста».

Зусім забылі падзерцы аб гэтай справе. Надышла вясна, а з ёю іншыя клопаты. Дзе тут будзеш думаць аб падатку, калі ў аднаго прапала канюшына, а ў другога пшаніца. Трэба падумаць аб насеньні,—паклапаціцца, каб поле не пуставала. Раптам у палове мая прыпёрлі акладныя лісты.

Зачухалі патыліцы падзерцы і папёрлі ў гарсавет. Але нічога нідзе не памагло. Думаюць цяпер падзерцы, як ім заплаціць падатак. „Каб увосень—было-б ляпей, а цяпер»...

І лаюць на ўвесь сьвет тых галавацяпаў, якія зрабілі такую штуку. А тым, відаць, і клопату мала.

«Лепей, позна, чымся ніколі»,—думала, відаць, падатковая камісія і ўсе, ад каго залежала гэтая справа, робячы такую «разумную» справу. А сляне? Аб іх ніхто не турбаваўся і ня думаў, як гэта ўвесну лёгка будзе ім плаціць падатак.

Неабходна каму належыць зьвярнуць увагу на гэту недарэчнасьць навучыць галавацяпаў думаць аб справах своячасова.

Паўлюк.

Будуем іпадром.

ГОМЕЛЬ. 18-6. Распачата пабудова іпадрому. Для іпадрому прадастаўлена плошча побач з конскім заводам. Кола іпадрому будзе раўняцца паўтары кілёмэтры. Робяцца дарожкі баявая і скакавая. Адчыненьне іпадрому намячаецца 15 ліпеня.

Арганізацыя лугавых гаспадарак.

ГОМЕЛЬ, 18-6. Белсельтрэсту перадаюцца лугавыя гаспадаркі акругі і сена-прасавальныя заводы Рэчыцкага і Камарынскага раёнаў для арганізацыі лугавых гаспадарак, якія будуць здавальняць патрэбы саўгасаў, ваенведа і розных арганізацый. Да гэтага часу луга эксплёатавалі праз здачу ў арэнду насельніцтву.

Да пабудовы торфа-падсьцілачнага заводу.

Гомель, 18-6. Акрземаддзел распачаў распрацоўку праэкту пабудовы ў акрузе механізаванага торфа-падсьцілачнага заводу. Узьнімаецца хадайніцтва перад СНК аб водпуску сродкаў на гэта. Завод дасьць больш 100 тысяч пудоў падсьцілу для патрэбы малочных гаспадарак, ваенведу і іншых арганізацый.

Лік укладчыкаў расьце.

Барысаў, 18-6. У час правядзеньня юбілею кас ашчаднасьці і правядзеньня разьяснёнчальнай кампаніі ў маі м-цы лік укладчыкаў павялічыўся на 109 чал., павялічыўся і лік укладаў на 4910 р. 84 к. У сучасны момант усяго ўкладчыкаў у барысаўскім аддзяленьні галоўнай Беларускай зьберкасы налічваецца 577 чал. на агульную суму ўкладаў—32710 р.

РАЗЬВІЦЬЦЁ МАЛОЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Гомель, 18-6. Акрвыканком узьняў хадайніцтва аб прадастаўленьні малочнаму саюзу 25 тысяч руб. у зваротны капітал для разьвіцьця працы саюзу.

Усе—укладчыкі кас ашчаднасьці.

Магілеў. Усе працаўнікі саюзу савгандальслужачых у мястэчку Журавічах сталі ўкладчыкамі касы ашчаднасьці. Таксама і настаўнікі раёну на сваім сходзе ўхвалілі атрымліваць пэнсію праз касы ашчаднасьці.

Выйгрышы па пазыках.

Барысаў. Барысаўскім аддзяленьнем дзяржбанку за апошні час аплочана 43 выйграшы, якія палі ў апошнім тыражы пазыкі індустрыялізацыі, усяго на суму 1200 руб.

Самы вялікі выйгрыш складаецца ў 250 р. Аблігацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі да гэтага часу аплочана 6 выйграшаў на 337 руб. 50 кап.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЬЛІ ЗА СРОДКІ КААПЭРАЦЫІ.

Бабруйск, 16-6. Сёлета за сродкі спажывецкай каапэрацыі арганізоўваюцца дзіцячыя ясьлі ў Клічаве і Парычах, і дзіцячыя пляцоўкі—у Сьвісьлачы, Бабруйску і Глуску. На адчыненьне гэтых дзіцячых устаноў адпушчана 1900 руб.

РАСТРАТА Ў ШКОЛЕ СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ.

Гомель, 18-VI. Школьны працаўнік Суткаўскай школы сялянскай моладзі растраціў атрыманыя ў касе Лоеўскага райвыканкому 200 руб. для выдачы вучням стыпендыі. Растратчык арыштаваны.

Заробку ня плоцяць з 1927 году.

Яшчэ з 1927 году за лесараспрацоўкі грамадзяне ня могуць поўнасьцю атрымаць грошы ад 3-га райёну МБВ чыгункі. Так, гр-ну хутара Доўгае, Зажэлкаўскага с.-с, Смалявіцкага райёну Балаш Іван Пілінаў два разы езьдзіў у 2-гі вучастак канторы МБВ, на станцыю Жодзіна за 5 рублямі, а дзесятнік Элькінд адказвае, што ўсе грошы выплачваюцца ў Менску. Аб нявыплаце грошай рабіў заяву і гр-н в. Корміца, Юраўскага с.-с., Руцевіч Сямён, які не атрымаў 12 руб. 45 кап. за рэзку і возку шпал. Кантора на месцы рэшту зарплаты не выплачвае, а накіроўвае ў Менск. Запазычанасьць 3-га райёну па лесараспрацоўках маецца ня толькі 2 грамадзянам, а куды большаму ліку. Ці магчыма кожнаму за 2-3 руб. ехаць у Менск і ці можна цягнуць і ня выплачваць зарплату з 1927 году?

Казак.

Будаўніцтво на ф-цы ЧЫМ ТЛУМАЧАЦЦА ЗАТРЫМКІ Ў БУДАЎНІЦТВЕ.

ГОМЕЛЬ. Будаўніцтва на Дабрускай фабрыцы распачата ў 1923 годзе. Зараз праводзіцца ўстаноўка 6-ай паперароб чае машыны, якая па сваёй магутнасьці наблізіцьць на 30 проц. прадукцыю фабрыкі; пабудова новага саломамасныга заводу з новым абсталяваньнем, пабудова новай сілавой станцыі з пераводам на тарфяны апал з уласных торфаапрацоваи фабрыкі і пераабсталяваньне і пашырэньне іншых пэхаў і аддзяленьняў ф-кі.

Праца вялізная, але і часу патрацілі шмат і капіталу ўкладзена не адзін мілён, а канца ня відаць. У чым справа?

Будаўніцтва вялося па частках і без агульнага пляну, ня кажучы ўжо аб тым, што іншы раз праэкт тае ці іншае часткі зацьвярджаўся тады, калі будаўніцтва блізілася да канца, ці будаваліся будынкі, якія стаяць па тры гады без ужываньня і г. д. Але аб гэтым ужо пісалася ў газетах і прымаліся тыя ці іншыя захады, між іншым ВСНГБ і СССР вымагалі ад трэсту складаньня агульнага пляну будаўніцтва.

Трэст і заводакіраўніцтва доўга працавалі над складаньнем пляну, мабілізаваўшы ўсе тэхнічныя сілы трэсту і фабрыкі, запрасіўшы некалькі спэцыялістаў з боку, і ў лютым 1928 г. плян быў пададзены ў «Лесбум», дзе ён ляжыць і па гэты дзень і, нібы, водуг слоў старшыні трэсту, 15 чэрвеня яго разгледзяць, прычым ён упэўнены, так што разгляд можа быць адкладзены, могуць запатрабаваць дадатковыя матар'ялы. Але гэта была-б не бяда, калі-б „Лесбум" ня ставіў у залежнасьць ад зацьверджаньня праэктаў выдачу ліцэнзій прадугледжаных прамфінплянам на заказ турбагенэратараў для новае сілавое станцыі. Ці верна пастулае «Лесбум». Я думаю, што не і вось чаму: зараз усе каменныя будынкі пабудаваны, заграничнае абсталяваньне атрымана, 6-ая машына зьбіраецца, пачынаюць пабудову новае сілавое станцыі, заказы па раней выдадзеных ліцэнзіях на 4 каты для сілавой станцыі ў Нямеччыне выкананы і не хапае толькі аднаго турбагенэратара, на які «Лесбум» не выдае ліцэнзіі. У выніку можа здарыцца, што будзе праз 3-4 месяцы сабрана 6-ая машына і разам з будынкам зробіцца мёртвым капіталам, бо рухаць яе ня на мёртвым капіталам, бо рухаць яе ня на нак новага салома-масавага заводу разам з імпартным абсталяваньнем, будзе стаяць будынак новай сілавой станцыі разам з 4-мя імпартнымі каталамі, якія па ўгаворы з фірмаю прыбудуць праз 6-7 месяцаў, будзе ляжаць загатаваны торф як леташняга, так і гэтага году. А ўсё гэта разам узятае—5 мільёнаў мёртвага капіталу без усякага руху, што будзе класьціся дзіжорам пры калькуляцыі пуду выпрацоўваемае паперы старым абсталяваньнем, ня кажучы ўжо аб тым, што за гэты час можна выпрацаваць на 80 проц. прадукцыі больш, якая ўвозіцца яшчэ і цяпер не ў малой колькасьці з-за граніцы. Адгэтуль пытаньне патрабуе хутчэйшага дазволу выдачы ліцэнзій на заказ турбагенэратару, які фірма можа вырабіць толькі ў працягу 8-10 месяцаў, а з датольні ў працягу 8-10 месяцаў, а з датольні ў ўстаноўкаю адзін год. Цяпер стаіць пытаньне, ці будзе гэты год ад ліпеня 1928 г. да ліпеня 1929 г., ці ліпеня зіі будуць выдадзены ў ліпені 1929 г. і тады пуск фабрыкі затрымаецца да ліпеня 1930 г. У залежнасьці ад гэтага скарацілася тэрмін бескарыснага знаходжаньня ўкладзеных сродкаў у мёртвым капітале. Старшыня ВСНГ БССР т. Карп браў на сябе адказнасьць за рацыянальнае выкарыстаньне ліцэнзій з просьбаю выдачы іх зараз-жа, але член Прэзыдыуму ВСНГ СССР т. Даўгоў без санкцыі „Лесбуму" ня ўзяўся іх выдаць, а ў гэтым заключаецца сур'ёзная небясьпека і на яе ўрадавым органам неабходна зьвярнуць сваю ўвагу, ужыўшы ўсе захады да таго, каб ліцэнзіі былі выдадзены, бо пры сапраўдным становішчы, ў якім знаходзіцца будаўніцтва, зацьверджаньне агульнага пляну нітва, зацьверджаньне агульнага пляну нітва, зацьверджаньне ня зможа зьмяніць патрэбу ў ім чынам ня зможа зьмяніць патрэбу ў турбагенэратары і яго магутнасьці, у чым пры абсьледаваньні будаўніцтва можна пераканацца. І гэтае пытаньне трэба вырашыць неадкладна і тады праз год будаўніцтва будзе скончана і фабрыка дасьць як эканамічныя, так і палітычныя вынікі.

А. АСТАПЕНКА.

ЯК БЕДНАТА ПАЛЕПШЫЛА СВАЁ ЖЫЦЬЦЁ.

Вёска Каралёўка, в якой пры земляўпарадкаваньні выйшаў пасёлак Луна, мела да рэвалюцыі 25 двароў. Вёска жыла на дзедаўскай трохполцы. Кожны двор меў больш дваццаці палос у полі, а сенажаці зусім ня мелі. Кожную вясну ўсе гаспадары жабравалі. У кожнай гаспадарцы была беднасьць, а ў неўраджайныя гады і голад.

Калі пачуўся гром Кастрычнікавай рэвалюцыі, вёска заварушылася і бяднацкія сны сталі збывацца аб павялічэньні зямлі. Разам з гэтым пайшлі чуткі на вёсцы, што зараз будуць зямлю дзяліць. Усе багацеі сталі радзіцца, каб астацца на месцы.

— Калі выйдзем на пасёлкі, дык прападзем без хлеба,—казалі яны.

Вясной у 1924 годзе пачынаецца земляўпарадкаваньне. 9 двароў беднаты згадзіліся перайсьці на пасёлкі. Арганізоўваецца адзін пасёлак і хутар Скрыгочуць зубамі заможнікі. Яны незадаволены, таму што ў іх адбірае беднята зямлю.

Беднята засталася вельмі здаволенай. Ёй далі шырокія палосы зямлі. Пачалі пасялкоўцы сеяць канюшыну. Зямелькі стала больш і пачала беднята прадаваць канюшыну, стала мець клопату.

Каралеўская беднята пачала будаваць сельскую гаспадарку па-новаму. Хлявы для жывёлы рабілі з цёплаю столлю і сьветлымі вокнамі. Завялі лепшую жывёлу. На шырокіх гародах пасадзілі фруктовыя сады, сеюць кораньплоды. Усе гаспадары пасёлка зьяўляюцца пайшчыкамі сельска-гаспадарчага таварыства, праз якое набываюць розныя гаспадарчыя машыны. У сёлетнюю вясну пасялкоўцы перайшлі на шматпольле, павялічылі засеў бульбы і вікі з канюшынай.

З лесу яны возяць лісьце і кучы мурашак на гной. З балота вывозяць торф, асушаюць нёўдобныя плошчы і робяць добрую сенажаць.

Ва ўсіх гэтых справах ім дапамагаюць сельскагаспадарчыя кнігі, якія яны бяруць і чытаюць калектыўна, а таксама ўважліва прыслухоўваюцца да парадаў агранома.

Чамаданаў Вас.

Чавускі р., Магілёўск. акр.

Кепская справа з пажарнай аховай.

У Барысаўскім раёне некаторыя дружыны вёсак ня маюць пажарнай маемасьці. 20 дабраахвотных дружын р-ну з лікам 607 чал. маюць 18 пажарных насосаў. У трох с.-с. ёсьць толькі пажарныя абозы. На вёску Чарнявічы—адзін пажарны сарай.

Райвыканком пастанавіў арганізаваць новыя пажарныя дружыны ў в. Лазіна, Адзяцкім, Касьцюкоўскім і Міатчанскім с.-с. Але гэта, мусіць, застанецца пастановай толькі на паперы.

Занаткі сярод дружыньнікаў праводзяцца толькі ў тых дружынах, дзе маюцца машыны, а іншыя не ядуць ніякай працы.

У савецкіх гаспадарках райёну пажарная ахова таксама пастаўлена незадавальняюча, бо і там ня ўсюды маюцца пажарныя машыны. Бываюць выпадкі, што здарыцца дзе-небудзь пажар, дык дружына сядзіць сабе ў сваёй вёсцы, бо з голымі рукамі вядома кепска весьці барацьбу з агнём.

Трэба палепшыць гэту справу.

А. С—віч.

Вялікая і звышвялікая Польшча.

Панская Польшча хацела-б стаць, як гэта патроху высьвятляецца, асяродкам, навакол якога згуртаваліся-б акалічныя яе народы: беларусы, ліцьвіны, украінцы і нават чэха-славакі, латышы і эстонцы, адным словам,—усе тыя народы, якія калісьці знаходзіліся ў межах былой „ад мора да мора" Польшчы, ці былі ёй хоць-бы часова падпарадкаваны.

Цяпер аб гэтых даўніх часох успомнілі ў Польшчы і ня толькі ўспомнілі, але сталі вельмі прарыста накякаць і нават папулярызаваць сярод шырокага грамадзянства думку аб стварэньні такой вялікай Польшчы.

Зразумела, аб стварэньні такой звышвялікай Польшчы сучасныя польскія палітыкі толькі мараць, толькі ўздыхаюць, толькі сьняць. Яны ведаюць, што як ні як, а цяпер не сярэдневечча, што ніводзін з вызваленых нядаўна народаў не захоча ўцягнуць сябе ў саюз з Польшчай, бо—перш за ўсё польская палітыка ў адносінах да сваіх нацменшасьцяў—нічога добрага не прадракае іншым дзяржаўным нацыянальнасьцям, якія павінны былі-б увайсьці ў саюз з Польшчай, як «роўныя з роўнымі». Усім вядомы гэтыя запаскуджаныя панскай палітыкай старой і новай Польшчы фальшывыя лёзунгі. Усё-ж той факт, што некаторыя польскія палітыкі ўзьнімаюць і гэта нават пытаньне, можна сабе ўявіць, да якіх „геркулесавых слупоў" дасягае іх палітычны авантурызм. Їм мала нават Польшчы ў межах 1772 г., їм хочацца яшчэ большага—злучыць у саюз з сабой і пад сваёй гэгэмоніяй народы, якія їм пажадзена. Дзеля чаго? Дзеля таго, каб, як кажуць прадстаўнікі гэтай фантастычнай звышвялікай Польшчы, абараніць усе гэтыя народы разам з Польшчай ад неблясьпекі з боку ворагаў? Усялякіх, але, галоўным чынам, ад «Масквы» і Нямеччыны.

Наіўным польскім палітыкам гэтага разраду здаецца, што ўсе народы, якіх Польшча павінна прыцягнуць у саюз з сабой, думаюць таксама, як і сучасныя польскія палітыкі і лічаць сваімі ворагамі ўсіх тых, каго лічыць і Польшча. Зразумела, польскія палітыкі гэтага толку моцна мыляюцца ў сваіх надзеях. І ўнутраны ўклад палітычна-сацыялістычных сіл і інтарэсы адносін з іншымі дзяржавамі ў памянёных вышэй народаў вельмі часта зусім не супадаюць з інтарэсамі Польшы і яны зусім на хочуць узалежнічаць сваё існаваньне ад капрызнай палітыкі польскіх паноў. Аднак, вельмі характэрна, што ў сучаснай Польшчы ўжо знайшліся такія палітычныя элемэнты, якія ў сваіх фантастычных імкненьнях заходзяць так далёка. Значыць, ёсьць у Польшчы і такія, што не здавальняюцца нават межамі старой Польшчы 1772 г., а гатовы ісьці і яшчэ далей.

Такія фантастычныя думкі выказваліся між іншым віленскай абшарніцка-манархічнай газэтай „Слово", прыблізна ў сярэдзіне мая г. г.

У тэй-жа газэце „Слово" трохі пазьней мы чыталі справаздачу аб урачыстасьцях, якія адбыліся 21-га мая г. г. у маёнтку Грашуўцы, Баранавіцкага павету, з прычыны прыбіцьця ў капліцы фамільнага маёнтку Рэйтанаў табліцы дзеля ўшанаваньня памяці польскага патрыёта Тадэуша Рэйтана, пасла ад навагрудзкае зямлі ў польскі сойм 1773 г.

Каб зразумець увесь сэнс і значэньне гэтага, на першы погляд, здаецца, нязначнага факту, нам трэба трохі спыніцца як на асобе самога Рэйтана, так і на падзеях таго часу, калі Рэйтан жыў.

Польскі сойм 1773-75 г. г., скліканы пад націскам Прусіі, Расеі і Аўстрыі, пацьвердзіў уступку Латгаліі (Інфлянто Польске), часткі Беларусі па ўсход ад Дзьвіны, Друці, і Дняпра—Расеі, Усходняй Прусіі, Варміі, часткі Куяваў і Вялікай Польшчы—Прусіі і Чырвонай Русі з часткай малой Польшчы—Аўстрыі.

Гэта быў першы так званы разбор Польшчы як дзяржавы.

Т. Рэйтан, як прадстаўнік польскага абшарніцтва ад Навагрудзкай зямлі, выказаў у сойме пратэст, меўшы характар безнадзейнай роспачы в прычыны палітычнай апатыі анархізаванага польскага грамадзянства (разумей—абшарніцтва, шляхэцтва), якая тады яго апанавала. Распачлівы пратэст Т. Рэйтана зусім адпавядаў настроям канчаткова ўжо спалёнізаванага беларускага абшарніцтва. Жывучы ўсё-ж сярод неспалёнізаванага беларускага сялянства, варожага да абшарніцтва польскай дзяржаўнасьці, гэтыя абшарнікі-рэнэгаты куды больш, чым сапраўды польскія абшарнікі, адчувалі небясьпеку для панскай Польшчы і яе залатых вольнасьцяй для паноў.

Анархізаванае, вар'яцкае польскае абшарніцтва таго часу, якое са зброяй у руках, падзяліўшыся на групы (канфэдэрацыі), змагалася за свае інтарэсы то з каралём, то з рознымі магнатамі, баялася страціць свае вольнасьці, ад якіх адрачыся ніяк не магло. Т. Рэйтан быў мо' адным з лепшых польскіх абшарнікаў, які адчуў раней чым іншыя небясьпеку для старой панскай Польшчы ад разбораў мо' толькі таму, што яго маёнтак быў у беларускіх землях, частку якіх адабрала ўжо «Масква». Мо' ён і не закрычаў бы распачліва ў сойме, каб ня гэты факт, за якім па лёгіцы падзей таго часу павінен быў надыйсьці і надыйшоў другі і трэці разборы Польшчы. Рэйтан не дажыў, праўда, да другога падзелу Польшчы і памёр у 1780 г.

І вось цяпер, у 1928 г., такія-ж роспачлівыя патомкі Т. Рэйтана,—паны абшарнікі з Заходняй Беларусі з-за «кардону», г. зн., з Усходняй Беларусі прыбілі да сьцяны каплічкі ў Грашуўцы, каля Ліхавіч, табліцу з такім надпісам: «Тадэуш Рэйтан, пасол Навагрудкай зямлі на сойм 1773 г. Нарадзіўся 20-VIII 1742 г. Памёр у Грашуўцы 8-VII 1780 г. Месца пахаваньня невядома. Дзеля ўшанаваньня памяці прадзеда, гэту табліцу ўфундавалі ў 7-ю гадавіну ратыфікацыі рыскага трактату страчныя праўнукі».

Як бачым, сухія словы табліцы нічога не гавораць. Вельмі нават сьціпла. Хіба толькі ў адным можна бачыць палітычны сэнс—гэта ў тым, што табліца „ўфундавана" ў 7-ю гадавіну рыскага трактату, па якім Польшча атрымала толькі меншую частку Беларусі, а ня ўсю яе, як гэта было-б пажадана панам.

Палітычны сэнс прыбіцьця табліцы выявіўся і растлумачыўся ў прамовах, якія былі сказаны на ўрачыстасьцях.

Першым, пасьля рэлігійных цэрамоніяў, увышоў на трыбуну наваградзкі ваявода п. Бэчковіч, які між іншым сказаў:

„Апошні крывавы пратэст, узьняты правадыром народу, першым маршалкам незалежнай Польшчы Язэпам Пілсудзкім, увянчаў ахвярнасьць крыві верных сыноў народу ашуканьнем незалежнай Польшчы, але, аднак, да апошняга часу ня ўсе землі, якія ўваходзілі калісьці ў склад найсьвятлейшай Рэчы Паспалітай, нам зьвернуты".

Мы бачым, што і наваградзкі ваявода, з. зн. зусім афіцыйная асоба, палічыў патрэбным у зьвязку з урачыстасьцю ўшанаваньня памяці Т. Рэйтана ўзьняць палітычную агітацыю за новыя крывавыя пратэсты з-за панскіх інтарэсаў на тых абшарах Беларусі, якія яшчэ не ўвайшлі ў склад Польшчы. Пан ваявода стаў на грубце чыста абшарніцкіх польскіх інтарэсаў, бо яму-ж добра вядома, што ў Заходняй Беларусі, і тым больш ва Ўсходняй, палякаў мала. Аграмадная большасьць і там і тут беларусы, якія і там і тут аднолькава ненавідзяць польскіх паноў.

Пан ваявода ня мог выступіць ад свайго імя. Яго словы маюць урадавы характар, і таму мы робім вывад, што п. ваявода выказаў погляд урадавых польскіх сфэр на справу. А раз так, дык значыць польскі ўрад трымаецца ў сваёй палітыцы да нас, г. зн. да БССР і СССР, захопніцка-абшарніцкіх поглядаў. Для п. ваяводы і абшарнікаў няма Беларусі і беларусоў, а ёсьць толькі найясьнейшая Рэч Паспалітая і інтарэсы польскіх абшарнікаў на беларускіх землях.

Так думаюць польскія абшарнікі Заходняй Беларусі разам са сваёй адміністрацыяй і сваім панскім урадам.

Такім яны ўяўляюць сабе і Т. Рэйтана, аб чым яскрава сьведчыць прамова нашага добрага знаёмага п. графа Юр. Чапскага, які выступаў пасьля п. ваяводы і сказаў наступнае:

«Тадэўш Рэйтан, гэты пакутнік закаханьня да бацькаўшчыны, гэты патрон пратэсту супроць гвалту і падзелу зямель Рэчы Паспалітай, гэта патрон перш за ўсё нас замежных—сыноў абрабаваных Масквой абшараў. Хто калі небудзь і пры якіх бы то ні было варунках бяз выстрылу вракаўся польскай зямлі, хто польскую ці беларускую людмасьць аддаваў на вьдзек барбарству абмаскоўленьня, той мусіў пераступаць праз грудзі Т. Рэйтана, праз яго цела, якое ляжала на пароге. Перадсьмяротны стогн Рэйтана дагэтуль не заціх; хто мае душу, той чуе яго заўжды на расшарпаных лініях калючых дротаў, на палёх Менскай вямлі, ён ляціць ад пакінутых, выданых саветам зямель—Магілёўскай і Віцебскай.

Я, дэлегат саюзу палякаў з беларускіх кресаў у Вільні, гэтых выгнаньнікаў з абрабаваных зямель, якіх перад гвалтаўніком уласнымі грудзьмі засланіў калісьці Рэйтан, тут пры гэтай яго табліцы ад імя таго-ж прысягаю ня толькі шанаваць яго памяць, але і быць верным яго запаведу».

Так гаварыў т. Чапскі. Пасьля яго гаварылі іншыя паны: Бохвіц, Піліпоўскі і пасол Раўлтоўскі, прамовы якіх «Слово» ня прыводзіць. Думаецца, аднак, што і яны нічога лепшага не сказалі, як сказалі п. п. ваявода і гр. Чапскі. Ураджаньне ад усіх гэтых патрыятычна-абшарніцкіх урачыстасьцяў адно: паны абшарнікі Заходняй

Праверка--самакрытыка--кантроль мас.

Злачынная безгаспадарчасьць у гомельскіх галоўных майстэрнях.

Гомель, 16-VI. Учора на сходзе рабочай молодзі ў гомельскіх галоўных майстэрнях АКК—РСІ зрабіла справаздачу аб сваёй працы. Выступаўшыя ў сярочках таварышы адзначалі шэраг фактаў безгаспадарчасьць у розных цэхах.

У такарна-мэханічнай майстэрні па выхаду электраапараду былі зроблены часткі для рухавіка, якія ў працягу 2-х год валяюцца без усякага дагляду. Два разы гэты недахоп абгаварваўся на вытворчых нарадах. Выносіліся пастановы аб прыняцьці мер да захаваньня гэтых частак. Аднак, адміністрацыя не зьвярнула ніякай увагі на пастановы рабочых. У выніку часткі гарэлі і рабочыя прымушаны быў зазваць аб гэтым ДПУ для прыняцьця належных мер.

На электрастанцыі майстэрні ня ўсё добра. Па віне электрастанцыі мацца прастоі ў розных цэхах. Былі выпадкі, калі некаторыя цэхі спынялі працу аб 11 гадзіне раніцы. Для зьніжаньня гэтых недахопаў рабочыя прапанавалі ўстанавіць на станцыі рухавік, які валяецца на дварэ ў працягу 3-х год. Праўленьне дарог пачало перапіску аб пакупцы дынама-машыны, а гэтая перапіска і зараз недзе знаходзіцца, а рухавік валяецца.

На станцыі Асіпавічы злачынна адносяцца да выпускаемых рухавікоў. Выпускаемыя рухавікі, праз кожныя два тыдні зварочваюцца назад для рамонту. Нядаўна на станцыю Асіпавічы паслалі новы рухавік, коштам у 8 тысяч руб. Як былі зьдзіўлены рабочыя калі гэты рухавік праз два тыдні прывезьлі на рамонт. Прышлося затраціць 10 тысяч руб. Пейская рука перашкаджае савецкаму будаўніцтву. Указаньні рабочых аб прыняцьці мер застаюцца без увагі.

На электрастанцыі лішні штат. Калі прыходзяць на праверку, адміністрацыя станцыі ўводзіць у заблуду абсьледавацелаў, указваючы на няіснуючыя пасады. Тэхнічны пэрсанал выкарыстоўваецца неэтазгодна.

Гаспадарчы-матар'яльны аддзел даставляе майстэрні недобраякасныя тавары. На гэтай прычыне нядаўна выпушчаныя вагоны сталі на рамонт. Аддзел закупляе непатрэбны асартымэнт тавару, які па некалькі год ляжыць на складзе і потым рэалізуецца амаль дарма. Нядаўна быў выпадак, калі адзелам былі закуплены па 7 кап. мётлы і пасланы ў тое месца, дзе іх можна купіць па паўтары кап. штука. Майстэрні патрабуюць тэрміновага абсьледваньня РСІ.

Непарадкі на асінаўскіх торфараспрацоўках.

Нядаўна было зроблена абсьледваньне рабочага камітэту Асінаўскіх торфараспрацовак. Пры абсьледваньні выяўлена шмат непарадкаў, якія зьявіліся штодзённымі і абавязковымі ў Асінаўскіх торфараспрацоўках.

Рабочы камітэт не зьвяртаў увагі на тое, што рабочыя хадзілі па хлеб за 12 вёрст ад месца працы. Той хлеб, які прывозіўся на месца для рабочых, прыкушаўся сялянамі.

Рабочы камітэт не рабіў ніякіх крокаў да таго, каб палепшыць становішча рабочых, якія знаходзіліся, дзякуючы «лоўкасьці» адміністрацыі, пад кодэксам законаў аб працы. Вартаўнік службу месяц, праслужыў два, пасьля тры месяцы, урэшце, праслужыў 4 месяцы і ўвесь час лічыўся адсёўным, атрымліваючы мізэрную плату за сваю працу. Кіпяцільшчык аставаў у 3 гадзіны раніцы і да 9 гадзін вечара знаходзіўся на працы. А гэты 18-цігадзінны рабочы дзень кіпяцільшчык атрымліваў нікчэмную плату і ня меў права на гэта нікому скардзіцца.

Жанчыны працавалі за 43-37 капек у дзень, а побач з імі працавалі кваліфікаваныя асобы, якія атрымлівалі па 4 рублі ў дзень.

Торфмайстру Алейнікаву „заблагорассудилось" спыніць раскарчоўку бамбука на той прычыне, што няма пачыкальнаў для рабочых. Гэты загад Алейнікава, зразумела, быў выкананы і пазьмныя рабочыя былі прымушаны працаваць працу і ісьці на ўсе чатыры боку. Тым часам загад торфмайстра выкананы хаця і „беспрекословно, но не дословно" і на раскарчоўку пнёў былі прыняты сяляне, якія зараз там працуюць, ня маючы асаблівай патрэбы ў заробках.

На торфараспрацоўках працуе звыш 100 чалавек рабочых. Памяшканьнямі яны зусім адпавядаюць сваёй назьве. Страхі дзіравыя, праз сьцены дзьме вецер. Гэта можна сказаць, дарэчы, адрасы не пра старыя баракі, а пра новыя, якія нядаўна пабудаваны і пра тое, што яшчэ будуюцца.

Колькі ні прасілі, каб Аршанскі аўтовы інспэктарыят аховы здароўя прызначыў для торфараспрацовак доктара, бо 600 рабочых маюць на гэта права і штодня ёсьць у гэтым патрэба, аднак, доктар не вызначаецца.

Што-ж, інспэктарыят ахоўвае ад здароўя Воршу; куды там яму да асінаўскіх рабочых. Яны закінуты ў балотную макрату, выкладаюць свае сілы на цяжкую працу ў надзвычайна цяжкіх умовах і гэтым рабочым вызначылі фэльчара. Фэльчар, даючы, мае ня гэту адну працу. **Гэта праца ў яго лічыцца пабочнаю.** Сталая яго праца больш паважная—ахоўваць здароўе сялян. Туды ён назначан акруговым інспэктарыятам. Да месца торфараспрацовак ад месца сталай фэльчарскай працы 8 кілёмэтраў і то праз непралазнае балота.

Інспэктарыят аховы здароўя ніводнага разу не пацікавіўся паехаць на Асінастрой і паглядзець як там жывецца рабочым. 600 чалавек рабочых яго ня цікавяць, нават у той час, калі яго не аднакроць прасілі вызначыць доктара.

Гэты факт павінен заслужыць увагу адпаведных органаў і ўсе непарадкі, якія назіраюцца на Асінаўскіх торфараспрацоўках, павінны быць зьнішчаны.

С. Азерскі.

Чыноўнікам ня месца ў савецкай больніцы.

„Дактары" першай барысаўскай амбуляторыі выкінулі зусім хворую жанчыну пад плот. Замест аказаньня мэдыцынскай дапамогі—хворую аблілі вадой. Сьледчы Верабейчык прызнаў учынкі „дактароў", правільнымі. Нягоднікі павінны быць пакараны.

Трр-рр-р, трр-рр-р,—злосна прагрымеў тэлефон.

Альлё!... Альлё!.. міліцыя слухае, у чым справа?

— Хутчэй дзяжурнага міліцыянэра! Убярыце хуліганаў.

Гэта званілі з першай барысаўскай амбуляторыі, прасілі тэрмінова забраць хулігана, які там паламаў усе вокны.

Хутка ў амбуляторыю быў накіраван міліцыянэр. Па дарозе ён спаткаў грамадзян, якія ішлі з больніцы.

— Куды вы, тав. міліцыянэр, ды тамжа нічога ня здарылася.

— Як ня здарылася, калі амбуляторыя прасіла забраць злачынца?

— Сапраўды там нічога няма, толькі ёсьць адна жанчына зусім хворая, якая ня можа хадзіць, вось яны вам і званілі, каб вы яе забралі ў міліцыю.

Гэтым адказам міліцыянэр не здаволіўся, (усяк бывае) і накіраваўся ў амбуляторыю. Прышоўшы ў амбуляторыю, ён убачыў—пад плотам каля самых дзьвярэй ляжыць хворая жанчына, якая зусім ня можа хадзіць. Аказалася, **мэдбюракраты не дачакаліся міліцыянэра і выкінулі хворую жанчыну на двор, ды акрамя таго, аблілі ўсю вадой.**

Міліцыянэр К. зьвярнуўся да доктара Сьвет у прысутнасьці яшчэ доктара Апт і адной фэльчарыцы:

— Навошта вы прасілі міліцыянэра?

— А... ён ужо пашоў—мы яго аб'яднанымі сіламі выдварылі з памяшканьня.

— Дык гэта значыць, вы так выдварылі «злачынца», які зусім ня можа хадзіць, ды яшчэ, бедную, вадой аблілі? Гэта-ж недапушчальны зьдзек над беднай жанчынай.

— Гэта наша справа,—адказаў доктар Сьвет, а ваша справа ўбраць—і баста.

Значыць, заўвет таго, каб даць запраўдную дапамогу і адпачынак хворай і беднай жанчыне, барысаўскія, выбачайце за выраз, «дактары», выкінулі міліцыю ўбраць і пасадзіць навіннага хворага чалавека. А 9 гадзіне ўвечары амбуляторыя ўжо зачынілася, а хворая засталася ляжаць пад плотам. Бязумоўна, ніхто ніколі не зрабіў-бы так, як цьвёрдалобыя мэдпрацаўнікі. Міліцыянэр К. узяў фурманку за свае ўласныя грошы, адвёз хворую ў дом селяніна, ды яшчэ заплаціў за месца.

Цяпер пабачым, як паглядзеў наш сьледчы тав. Варабейчык, калі да яго зьвярнуўся міліцыянэр тав. К., каб высьветліць ці справядлова аднесьліся мэдпрацаўнікі да хворай жанчыны. Выслухаўшы ўсю справу, Верабейчык толькі галавой паківаў.

— Па-мойму, яны паступілі правільна, гэта справа міліцыі.

Не, як відаць дык і сьледчы Верабейчык такі цьвёрдалобы, як мэдпрацаўнікі.

Гэтыя зьявішчы не павінны заставацца так, цьвёрдалобыя мэдпрацаўнікі павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці за зьдзек над працоўнымі.

Ал. Станкевіч.

НЯДБАЙНАСЬЦЬ І СЬПЯЧКА БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ І БЕЛСЕЛЬСАЮЗУ.

Г)... Канстатаваць недапусьцімае выкананьне Белсельтрэстам дырэктыў Эканамічнай Нарады аб прадстаўленьні плянаў пабудовы ільнозаводаў. Аб гэтым паставіць на від Белсельтрэсту і апублікаваць у прэсе (З ПАСТАНОВЫ ЭКАНОМНАРАДЫ АД 11 ЧЭРВЕНЯ).

Увесь час партыя і ўлада ставяць пытаньне аб пашырэньні індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, нават асыгноўваюцца на гэта досыць буйныя сродкі, але пабудова заводаў па апрацоўцы сыравіны сельскай гаспадаркі ў нас слаба пасоўваецца наперад.

У чым-жа справа?

Справа ў нядбайнасьці, у адсутнасьці належнай увагі з боку тых арганізацый і ўстаноў, якім даручана выкананьне гэтай вялікай і вельмі важнай справы.

Зьвернемся да фактаў.

У пляне бягучага году Белсельсаюзу было прадугледжана і зацьверджана вышэйшымі органамі пабудова склад даў для яек і птушачных хладабойняў, нават на гэтую мэту Белсельбанк вызначыў адпаведны крэдыт. Пабудова быў таксама Белсельсаюз сёлета будаваць бравярныя і крахмальныя заводы, але справа так і ня зрушылася з месца.

Белсельсаюз не паклапаціўся аб тым, каб своечасова падрыхтаваць праэкты, каштарысы, і нават сам прадстаўнік Белсельсаюзу на пасяджэньні ў Дзяржпляне заяўляе, што крэдыты яны ня змогуць скарыстаць, бо... праспалі...

Сьпіць і кіраўніцтва Белсельтрэсту, якому яшчэ 4-га сакавіка Эканамічная Нарада даручыла ў месячны тэрмін распрацаваць плян пабудовы заводаў па апрацоўцы лёну і па ўзгадненьні з Наркамземам прадставіць на зацьверджаньне ў Дзяржплян.

Зразумела, праз месяц дырэктывы органу ўлады выкананы ня былі.

Дзяржплян пачынае націскаць і ўжо 3 разы пісаліся прапановы Белсельтрэсту, амаль што праз дзень званілі па тэлефону, а праэктаў усё яшчэ няма.

На пасяджэньні прэзыдыуму Дзяржпляну 5 чэрвеня прадстаўнік Белсельтрэсту запэўніў, што праэкты высланы з Масквы 3-га чэрвеня і праз пару дзён будуць прадстаўлены на зацьверджаньне.

Сёньня мы маем ужо 19 чэрвеня, а праэкт усё яшчэ не прадстаўлены і, відаць, будаўніцтва заводаў сёлета ўсё-ж не пачнецца.

З. В-ль.

Ёсьць у нас яшчэ Мітрафанушкі.

Нам усім досыць добра відома, што наша краіна яшчэ далёка ня вывучана, а таму з году ў год наладжваецца шэраг навуковых экспэдыцый, экскурсій, таму на мясцох працуюць нашы краязнаўчыя таварыствы і працы ўсім хапае.

Часам да нас прыяжджаюць досыць вучоныя сілы з іншых рэспублік Саюзу і ўносяць сваю лепту ў агульную працу па вывучэньні БССР.

Гэтымі днямі да нас прыехаў т. Папоў, якога камандыраваў Ленінградзкі дзяржаўны расейскі музэй для этнаграфічных работ у БССР. Тав. Папоў дагаварыўся в Інбелкультам і Галоўнаукай аб той працы, якую яму прыдзецца выканаць і яму парадзілі паехаць у Слуцкі і Мазырскі раёны, якія, да слова сказаць, яшчэ амаль зусім ня вывучаны.

Здавалася-б, трэба толькі вітаць таварыша, які дапаможа нам у агульнай працы, але ў адміністрацыйным аддзеле Менскага акрвыканкому там яшчэ і зараз сядзяць Мітрафанушкі, якія кажуць—навошта нам геаграфія, але да справы.

Прыходзіць т. Папоў у адміністрацыйны аддзел атрымаць пасьведчаньне на права карыстаньня картай у час сваёй экспэдыцыі.

Чыя, які ведае гэтымі справамі, паглядзеў сурова на т. Папова і кажа:

— Тут не Сахара і можаце абыйціся бяз карты.

— Выбачайце, таварыш, я-ж бяз карты не магу весьці працы, ды наогул карта 40-вёрстка і я еду ня ў прымежныя раёны.

— У нас уся Беларусь прымежная і картамі карыстацца нельга, упарта адказаў чын.

—Таварыш, вы-ж зрываеце мне работу, на якую я прыехаў з Ленінграду... вось вам дкументы...

—Калі жадаеце мець няпрыемнасьць, дык бярэце карту з сабой, але вас могуць на месцы арыштаваць,—катэгарычна адказаў Мітрафанушка.

Так і пашоў тав. Папоў ні з чым з адміністрацыйнага аддзелу.

„КАЛІ СЬПЯВАЮЦЬ ПЕУНІ"

НА СЦЭНЕ БДТ 2.

17 чэрвеня г. г. БДТ 2 паказаў прэм'еру, п'есу Юр'іна «Калі сьпяваюць пеўні». У гэтай сваёй апошняй пастаноўцы сэзону 27-28 году наш малады тэатр яшчэ лішні раз давёў, што ён можа справіцца з тымі задачамі, якія на яго ўскладае наша грамадзкасьць. Ня гледзячы на тое, што сама па сабе п'еса напісана несьмешна, усё-ж такі малады рэжысэр Міхоа Міцкевіч досыць удала справіўся з пастаноўкай. У пастаноўцы гэтай п'есы, ня толькі пачынаючаму маладому рэжысэру як т. Міцкевічу, а нават і больш адукаваному старому рэжысэру вельмі цяжка знайсьці такія формы пастаноўкі, якія-б маглі зрабіць п'есу вельмі цікавай і дынамічнай. З боку дэкарацыйнага афарміленьня мастаку Гольцу не ўдалося ўсё-ж такі паказаць усяе тае монумэнтальнасьці, якая характэрна для немцаў і асабліва для нямецкай буржуазіі.

Тав. МІЦКЕВІЧ
артыст БДТ 2, пастаноўшчык п'есы.

Залішне доўгія маналёгі Гальбэ, Ландэцкага, Райнэке і Ун-Фан-чана, ад чаго мясцамі становіцца нудновата. Скарацілі значна маналёгі, уся п'еса ад гэтага толькі выйграе. З выканаўцаў асобных роляў трэба адзначыць Ільінскага (Гальбэ), Саннікава (Ландэцкі), Скальскага (Райнэке), Маўчанава (кітайца Ун-Чан-фана), Станюта (дачка капіталіста Чайкоўскага, правакатара), якія, бязумоўна, справіліся са сваімі ролямі і кожны з іх намаляваў па ролі вобраз досыць удалы.

Ці справіўся т. Міцкевіч, як рэжысэр першае свае пастаноўкі?

Трэба адказаць, што з гэтай задачай т. Міцкевіч справіўся, і зусім зразумелы тыя шчырыя прывітаньні, якія так горача віталі артысты свайго таварыша і рэжысэра першае самастойнае пастаноўкі.

Глядач.

ЧОВЕН У МОРЫ.

(Апавяданьне).

...Зараз, калі ўлягліся навальніцы і даўно ня чуваць раскатаў ды рэжучых маланак 19-га галоднага, прашытага кулямі і тыфусам, году—неяк цяжка расчыняецца тоўстая кніга ўспамінаў...

Цьвільлю парастаюць яе старонкі, хоць і напісаны яны крывёю, жалезам ды пажарамі.

...О, Беларусь—
бурштыновыя сьцежкі, шум яварў ды прыдарожных бяроз,
капаплянная,
кужэльная,
лапцюжная—
ты ўліла і свой поўнагучны акорд у вялікую гаму Рэвалюцыі!..

Па саламяных вёсках і па драніцах аднавокіх дамоў твоіх мястэчак, па балотцах ды сасоньніках,
па ракох ды па полю перакатнаму—
гудзелі,
біліся
і ўзьнімалі жах
разлаваныя хвалі сацыяльнага шторму.
І на могілках мінуўшчыны,
над зялёнымі крыжамі адыйшоўшага,
вырасталі тады постаці—дробныя,
кяпрыкметныя,
але неабдымныя па рашучай аддасьці свайму часу, па творчаму ўзьлёту і непарушнасьці ў мэтах.

Гэтыя постаці складаюць гэроіку 19-га галоднага, прашытага кулямі і тыфусам...

Можа ўсё гэта—толькі бэзавы сон, міраж, лятуценьне?..

Ціха-ціха.

У рабінах заблытаўся вечар і нельга ўцяміць—
ці гэта гарыць захад рубінавымі пырскамі паміраючага сонца, ці проста наліваюцца на рабінах ягады...

Вось такой парою, у ліпені, штогодна паўстае ў маёй памяці вобраз спакойнага, чарнявага хлапца-арганізатара першай у нашай вакрузе камуны...

Яго звалі Хаім Кац.

. . . . . .

З Хаімам мы гадаваліся разам.

Радзіма наша—
земляробчы, пераважна-яўрэйскі, пасёлак Кляновік, ля мястэчка Свалкі, у Беларусі. Пасёлак—у сыпучых пяскох загублены, да рэчкі Плёскі абы як прыткнуты, цёмнай сьцяною Крыганаўскага лесу абгароджаны.

Рос Хаім маленькім, забітым.

На шостым годзе маці—абыйміста, цяжкая жанчына, прозьвішчам Есла—прымусіла Хаіма бегаць у хэдэр, дзе сівабароды раб-Афроім растлумачваў хлапчукам асновы Талмуду.

Праўда, для замацоўваньня ведаў паважаны раб-Афроім лічыў найлепшым пэдагагічным сродкам кляновую лінейку, бязьлітасна катуючы ёю вучняў—але бегаць у хэдэр усё-такі прыходзілася...

Бывала, калі гулялі ў лапту і Хаіму выпадала імчацца «на кон» выручаць «лапту», пад верны ўдар мячыка, ён бялеў, рыжаватыя бровы яго выгіналіся ў коскі і Хаім бег пад удар.

У такіх выпадках, стаяўшы на кану звычайна «смазваў» і шчасьлівы Хаімка ўлятаў не зачэплены за мяжу.

У вачох Хаімкі заўжды яскравілася адценьне наўлоўнае журбы і разам з тым—глыбокага, недзіцячага разуменьня акаляючага.

Усё, за што ні браўся Хаім—прапрацоўвалася сур'ёзна, абдумана і ўсебакова.

Раб-Афроім няраз гаварыў:

— Фун дэм інгл кен арэйс а рехтэр роз...*)

— Галавай рыбэйнэ шэл эйлом!..**) —адказвала старая Есла...

Сплыло ў чорнае возера нябыту некалькі год. Усякі год—вясёлкавых і халтурных, ружовых і шэрых... Апомніх—больш...

... Аднойчы мы стаялі на двары суседа—Тодара Барыгі.

— Цяжка жыць, Лявон,—сказаў мне Хаім Кац,—народ прыціскаюць... Разумееш?..

Ня лічаць за людзей нас... Апанавалі вуражнікі ды станавыя... Стогне зямля...

Я заўважыў праз паркан, як на добрых, вараных конях з гікам прапесьліся міма двара двое стражнікаў...

— Эх,—крыкнуў Хаім,—на прыцэл-бы іх!..

І агонь прагавітае помсты зазьяў з пад расьцягнутых трохкутнікаў яго брывей.

Тады я падумаў:

— З Хаіма Каца—ня выйдзе рабін... Для Хаіма Каца—другая дарога... І ён павінен пайсьці па ёй!..

. . . . . .

Па начох нясупынная страляніна пужала ваколіцу. У ціхіх дамох шчыра веруючыя «балабосты» (гаспадыні) запальвалі тонкія сьвечы ў пазалочаных кандэлябрах. Было напружана і жахліва...Непакойна—і ўрачыста...

На сходзе жыхароў, Хаім Кац, прыехаўшы з фронту, сем разоў ранены, абвясьціў:

— Треба арганізоўваць сельска-гаспадарчую камуну... Ну, вось хоць-бы ты Мотэлэ... У цябе ўласнай маемасьці—хіба што жонка ды пара дзяцей... І з чаго толькі жывеш?!. А Навум Салавейчык?.. Бацька—на вайне забіты... З голаду пухнем... Камуну—і ніякіх! Ну, што скажаце?.. Хто...

Праскрыпеў дзягцярны гандляр Нохім:

— Ой, вэй мір... Ня трэба!.. Дзяды і прадзеды без «камуны» жылі—і нам загадалі...

Ня трэба... А шлехтэр гешэфт!.. Навошта камуна нам, навошта?..

Падала голас моладзь кляновіцкая:

— Камуна—гэта камуна... Нібыцам—і лягчэй жыць стане... Няхай будзе!

Валі ў камуну!.. Таварыша Каца—за старшыню... Пішэце...

... На белых варотах парку, што раскінуўся перад маёнткам разбуранага памешчыка Мігаева, шыльда каравымі літарамі засьмялася:

«Луч Октября"

— Земледельческая коммуна бедняков-евреев
поселка Кленовік, Свалковской волости.

... Да Ленінграду падыходзіў Юдзеніч.

У вагні, стогнах і начуванай пакуце захліпалася крывёю вішнёвая Украіна.

У шафраным арэнбурскім стэпу ўздымамі паўстаньне басмачы...

А каля нашага пасёлку, каля камуны „Луч Октября" рыскалі табуны «залёнаўцаў» на чале з славутай „Марусяй". Той самай вар'яткай Марусяй, якую потым усё-такі застрэліў на двары спраўдому ў Свалках мой сябра—чэкіст Вінка Глотаў...

Пра лёс Хаіма Каца, як старшыні камуны, Вінка расказаў мне так:

— За чымсьці адвярнуўся Хаім на два дні ў пасёлак—чатыры-ж вярсты ўсяго ад камуны. У ліпені было гэта, у самую гарачыню... Жалуды сьпелі... Я тады быў у Свалках сьледчым Чэка. Якраз напярэдадні езьдзіў з атрадам ЧОН'у на бандытаў, у аблаву... Больш сотні вёрст аб'ехалі—і вынікаў—аніякіх...

Пахавалася банда.

Ну, ляжу гэта ў бакоўцы, пры памяшканьні Чэка, адпачываю...

Раптам—дзьверы пасьцежк і ўносяць міліцыянэры яго... (Хаімку, стала быць...)...

На рагожыне—і шынэляю прыкрыт. Твар—што хмара дажджавая і волас прыліпшы...

. . . . . .

... І цяпер, калі ў малінавы закат ціхутка, жартуючы, пеніць далячынь цьвярозы вецер і рэдка-рэдка скоціцца з-пад скроні жорсткая сьлязіна—ён устае ў маім уяўленьні—
мужны, спакойны хлапец, з расьцягнутымі трохкутнікамі брывей, з глыбокім зіркам захаваных пад лоб вочаў.

Імя яго—Хаім Кац.

Радзіма—Кляновік, земляробчы пасёлак ля мястэчка Свалкі...

... О, крыжавыя дарогі мінулага!

Над вамі шуміць шматпакутны лёс Беларусі—яе жах і лямант...

Часінаю, у дні ўздыму і росквіту, ён навявае ўспамін аб гэроіцы, энтузіязьме і ахвярах...

Юр. Лявонны.

*) З гэтага хлапчука можа выйсьці добры рабін...
**) Дай-жа, госпадзі!..

ГОМЕЛЬСКІ ПЭДТЭХНІКУМ ПАТРАБУЕ НЕАДКЛАДНАГА АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ.

Школа і настаўнік цяпер як ніколі павінны стаяць у цэтры нашае ўвагі. Гэта думка была выказана на 15 пардзіцкім зьезьдзе т. Молатавым. Зусім зразумела, што асабліваю ўвагаю павінна карыстацца новае савецкае настаўніцтва, маладыя пэдагогі. Аднак, пры ўсёй увазе мы ня бачылі добрага настрою на выпуску 22 школьных новых працаўнікоў у Гомельскім пэдтэхнікуме. Ня было добрага настрою ні у выпускнікоў, настаўнікаў, ні ў іншых прысутных. Некаторыя таварышы спрабавалі растлумачыць гэта становішча напружаным пасьлядовым пэдагагічнай рады, якое адбылося напярэдадні. Такое тлумачэньне сказ нічога не гаворыць. Прычыны былі важныя. Тэхнікум у канцы гэтага навучальнага году ў поўным сваім складзе падпісвае рапорт за шматгадовую старую сыстэму працы, «за грахі бацькоў», калі можна так сказаць. Гэта ўзрадавала і ёсьць падставай, калі вучні і настаўнікі канчаюць год ня з тым бадзёрым настроем, якога трэба было чакаць.

«ПРЫНЦЫПОВЫЯ» ЛЮДЗІ.

Пры шасьці курсах (4 асноўныя, 2 дапаўняльныя) і 214 студэнтах скончылі тэхнікум толькі 22 чалавекі. Такая малая колькасьць тлумачыцца тым, што з апошніх курсаў шмат выехала ў РСФСР, бачучыся беларусізацыі (кожны стварае сабе які небудзь жупел!) і ўтварае сутнасьць ня ў гэтым. Сутнасьць у тым, што ў гэтым годзе перадзі ў практыцы тэхнікуму тры **такіх апошняга курсу на скончэньні.** Ды і ня толькі апошняга курсу. На першым пакінута на другі год 2 чалавекі і **выключана дзесяць.** На другім—пакінута на другі год 3 чал., **выключана шэсьць,** летнія працы дадзены 28 чал. На трэцім—**выключана тры,** летнія працы дадзены трох.

Паколькі выключэньне, і асабліва з апошняга курсу, было зьявішчам да гэтае пары ў тэхнікуме вячуваным, становішча стварылася даволі цікавае. Выключаныя (народ у большасьці выпадкаў «баявы») трымаліся выклікаюча. Іншыя студэнты, звычайна ў быце далёка некалектыўна настроеныя, з-за салідарнасьці падтрымлівалі некаторых «ахвяраваных». Чуліся галасы, што настаўнікі прычэпліваюцца, не паперадзіўшы своечасова адстаючых, што падрада выключна базуецца на кваліфікацыйнай працы і ня ўлічвае гадавое пасьпяваемасьці. Былі і такія выгукі, што настаўнікі застрашаюць замест таго, каб выхоўваць. Паколькі гэта верна, меркаваць цяжка. Але што выключэньне з тэхнікуму правільна,—не падлягае сумненьню. Яскравым прыкладам можа служыць студэнт 4 курсу Бондар. У тэхнікуме вучыўся сем гадоў (!). Сын заможнага серадняка, увесь час быў стыпэндыятам. Ня здаў 6 залікаў, кваліфікацыйная праца зусім няпісьменная. З 9 заданьняў па гісторыі партыі ў працягу году здаў толькі 3. Але гэта мала. Бондар рэйшты член камсамолу. Выключан, як перарэстак. Узімку ён набраўся адвагі заявіць загадчыку вучэбнае часткі: **«Гісторыі партыі прынцыпова здаваць ня буду»** Вось гатакі прынцыповы чалавек 7 гадоў атрымліваў стыпэндыю, вайнаў месца, сядзеў на 2 гады на курсе.

Калі ў гэтым годзе было пастаўлена пытаньне аб выключэньні, Бондар абразіўся. Бондар гатоў абвінавачваць ва ўсіх грахох пэдагагічны пэрсанал. А апошні знайшоў новы «выхад»: склікаць бесстароннюю камісію, каб праверыць веды 2 выключаных з апошняга курсу. Трэцяй—слухачцы—дадзена праца на лета.

На трэцім курсе, адзін з выключаных матываваў сваё нежаданьне вучыцца тым, што ў яго „няма інтарэсу да пэдагагічнае дзейнасьці". Правучыўся чалавек тры гады і толькі потым адумаўся, што ў яго «няма інтарэсу».

Таварышы, блізкія да тэхнікуму, кажуць, што пібы нехта з Акрана абяцаў выключаную тройку паслаць настаўнікамі на вёску. Матыў—ёсьць і горшыя ў сельскіх школах. Калі гэта будзе так, дык мабыць на другі год прыдзецца выключыць чалавек 15, —усёроўна настаўнікамі пашлюць.

«НЯМА НАОГУЛ НІЯКАЕ ПЭРСПЭКТЫВЫ»

Гэты год пераломны ў жыцьці тэхніку. І ня толькі таму, што тэхнікум, пазбаўляецца баласту і сьмецьця. Пераломным трэба лічыць яшчэ і таму, што партыйны ўплыў упяршыню пачынае сур'ёзна сказывацца на жыцьці тэхнікуму. Да заснаваньня партыйнае ячэйкі (восень 1927 г.) і асабліва абсьледваньня працы ячэйкі і жыцьця тэхнікуму ў сакавіку 1928 г.—твар тэхнікуму быў зачынен для сваіх асобным жыцьцём. Абсьледваньне выявіла шмат недахопаў. **Тое, што накапілася ў працягу шэрагу гадоў, урэшце было выкрыта.**

Пры агульным цяжкім матар'яльным і кватэрным становішчы студэнцтва, былі выкрыты агідныя формы быту і настрояў. Ненармальныя адносіны між адміністрацыяй і студэнцтвам былі штодзённым зьявішчам. Замоўчваньне, адсутнасьць самакрытыкі і ўрэшце ўпадніцтва сярод вучняў. Апошняе, праўда, толькі ў некаторых асоб. Людзі «без малага ў восемнаццаць гадоў» заяўлялі, што няма ніякае наогул пэрспэктывы, лічылі, што Есенін быў правы, скончыўшы жыцьцё самагубствам і сур'ёзна думалі пасьледаваць яго прыкладу. Праўда, такіх было мала, але яны былі і кепска ўплывалі на іншых. Таварыскіх дачыненьняў між студэнцтвам ня было. Сьвядомасьць, што пэдтэхнікум павінен быць адзіным цальным калектывам, адсутнічала. Жылі людзі ў мурох інтэрнату і часам тэхнікум напамінаў далёка не савецкую школу. Адсутнасьць сувязі з горадам і вёскаю яшчэ больш дапамагала гэтаму. **Тэхнікум ня шэфствуў над якой-небудзь вёскай, хоць усе іншыя пэдтэхнікумы Беларусі з посьпехам праводзяць гэту працу.** Была спроба наладзіць сувязь з заводам «Двигатель Революции», але нічога з гэтага ня вышла.

Пасьля абсьледваньня адбыўся дыспут на тэму: „Бытавы і ідэалёгічны стан калектыву". Дыспут прайшоў даволі актыўна. Выказалася 22 чалавекі. Як прычыну слабой грамадзкай працы, выстаўлялі акадэмічную перагружанасьць. У тэхнікумы прымаюцца скончыўшыя сямёхгодкі без выпрабаваньняў. Слабая падрыхтаванасьць скончыўшых сямёхгодкі прыводзіць да таго, што паступаўшыя ў тэхнікум не спраўляюцца з заданьнямі. Гэта ўскладняе вучобу. Ня менш важная другая прычына—адсутнасьць патрэбнае ўвязкі між акадэмічнай і грамадзкай працай.

Дыспут выявіў у быце студэнцтва „абломаўшчыну", наліччa рэлігійных настрояў на першых курсах. Выкрыты былі балячкі, якія набылі ў апошні час хранічны характар.

Пасьля абсьледваньня і асабліва пасьля дыспуту, студэнцтва пачало бачыць пэрспэктывы. Пачалі стварацца ўмовы, якія дазваляюць выхоўваць настаўніка-грамадзкага працаўніка.

«ПЭДУХІЛ І ЁСЬЦЬ І НЯМА».

Такое заключэньне даў настаўнік пэдтэхнікуму аб адным вучні. Па праўдзе кажучы, больш мудрага нічога і ня скажаш. Толькі такая мудрасьць напамінае аднаго рабіна, які заўсёды маўчаў. Тлумачылі гэта яго вялікім розумам, які ня можна было выказаць праз маленькі рот. Гэткая і падобная „дыплёматыя" шкодна адбіваецца на жыцьці пэдтэхнікуму. Яна і прыводзіць да такіх вынікаў, калі прыходзіцца выключаць чалавека, які правучыўся ўжо 7 гадоў (замест таго, каб выключыць 3 гады таму назад). Нежаданьне адкрыта выказаць сваю думку, перашучае галасаваньне (рука падымаецца так, што нельга сказаць, ці галасуе чалавек, ці ўстрымліваецца) прыводзіць да таго, што выключаныя (1-га курсу) вінаваціць у гэтым дырэктара. Падстава—подрада маўчала, а т. Касьцеяч гаварыў, ён і выключыў.

Такая недарэчная папулярнасьць дырэктара толькі шкодзіць працы. **Настаўніцкі калектыў павінен разумець, што яму даручана сур'ёзная справа выхаваньня новых пэдагогаў і што ўсе настаўнікі нясуць адказнасьць за жыцьцё і вучобу ў тэхнікуме.** Гэтага разуменьня, як відаць, няма, яго трэба дамагчыся.

З настаўнікаў 7 ведаюць беларускую мову, адзін—часткова і 7—ня ведаюць. З восені пэдтэхнікум канчаткова пераходзіць на беларускую мову.

Зробленае сёлета ў галіне беларусізацыі трэба адносьці за кошт толькі апошніх месяцаў. Такім чынам, новая задача—падрыхтавацца да поўнай беларусізацыі ў будучым навуч. годзе.

* * *

Пэдтэхнікумы непасрэдна падпарадкаваны Наркамасьветы.

За гэты год у гомельскім пэдтэхнікуме інспэктар Наркамасьветы быў адзін раз і то выпадкова. Факт вельмі ненармальны. Мясцовыя арганізацыі зараз аддаюць тэхнікуму шмат увагі, але без належнае дапамогі Наркамасьветы справа ня будзе мець посьпеху.

Мы сьвядома так доўга спыніліся на становішчы ў Гомельскім Белпэдтэхнікуме. Прычынаю зьяўляецца тое моркаваньне, што ва ўмовах Гомельшчыны, дзе задача заўладаньня беларускай мовай і азнаямленьня з беларускай культурай актуальна, Белпэдтэхнікум павінен адыграць вялізную ролю. **У пытаньнях азнаямленьня рабочых мас з беларускай культурай пэдтэхнікум павінен займаць першае месца. Гэтага ня было на працягу двох апошніх гадоў, але гэтага трэба дамагчыся з новага навучальнага году.** Пытаньне аб падрыхтоўцы настаўнікаў—грамадзкіх працаўнікоў, зразумела само сабою.

Таму перад НКАсьветы стаіць неадкладная задача—палепшаньне становішчы тэхікуму, **папаўненьне пэдагагічнага складу вопытнымі пэдагогамі і партыйцамі, палепшаньне сацыяльнага складу новага набору ў гэтым годзе.** І, урэшце, калі НКАсьветы непасрэдна кіруе тэхнікумам, дык кіраўніцтва павінна быць не папяровым, не выпадковым і заездамі інспэктароў, а сапраўдным кіраўніцтвам, дазваляючым ў патрэбным напрамку выхоўваць і выкарыстоўваць 250 чалавек культурнае моладзі.

В. СТАНКЕВІЧ.

„Мягкий" ложак — рэч добрая.

ТЭРМІНОВЫ ЗАГАД АБ ВЫСЫЛЦЫ «МЯГКОГО» ЛОЖКА.

На станцыю Ворша чыгункі МБВ прыехаў працаваць са Смаленску нехта Раганкоў. Раганкоў застанавіўся ў пакоі паравознай брыгады дэпо чыгункі.

Для Раганкова жыцьцё разгарнула ўсю сваю пекнату,—працуе 8 гадзін, казённая кватэра, ложак і яшчэ шмат чаго іншага.

Здавалася-б, што Раганкоў здаволен, але натура чалавека не застанаўліваецца ні перад чым.

Для Раганкова яшчэ шмат чаго не хапала.

А самага галоўнага—

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра скарачэньне крэдытаў Белсельбанку па некаторым мерапрыёмствам, вызначаным па пляну вытворчага крэдытаваньня Белсельбанку і пра перасоўку гэтых крэдытаў у іншыя галіны народнай гаспадаркі.

Заслухаўшы заключэньне Прэзыдыуму Дзяржаўнай Плянавай Камісіі, Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што да гэтага часу на шэрагу мерапрыёмстваў па індустрыялізацыі селаскае гаспадаркі адпаведнымі арганізацыямі (Белсельтрэст, Белсельсаюз, Гомельскі Акрвыканком) не паданы будаўнічыя планы і праекты, а ў некаторых выпадках адсутнічаюць нават заяўкі.

У зьвязку з гэтым лічыць мотывацыйным прыняць наступныя прапановы, датыкаючыя выкананьня будаўнічай часткі пляну, індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі і зьмен у крэдытным пляне Белсельбанку:

а) прыняць да ведама паведамленьне прадстаўніка Белсельбанку, што да гэтага часу сельска гаспадарчая кааперацыя атрымала на малочную справу 260 тыс. руб., г. зн., усю суму, прадугледжаную на пляну (выключаючы крэдыты для калгасаў), якая скарыстоўваецца на абсталяваньне розных заводаў па пераапрацоўцы малака. Адзначаючы поўнае выкананьне крэдытна-фінансавага пляну ў гэтай галіне, прапанаваць Белсельсаюзу да 1-га ліпеня падаць у Дзяржплян (з копіяй у Белсельбанк) сьпіс таварыстваў, якія будуюць малочныя заводы і паказаць у сьпісе кошт пабудовы кожнага заводу;

б) крэдыт у суме 10 тыс. руб. на пабудову яечных складаў і птушачых хладабойняў з пляну Белсельбанку выключыць з прычыны адсутнасьці адпаведных заявак з боку Белсельсаюзу;

в) выключыць з пляну Белсельбанку крэдыт на пабудову фабрыкі каўбасаў у лічбе 20 тыс. руб., бо даўгатуль няма пляну на пабудову, а таксама і заявак на сродкі ад зацікаўленых арганізацый;

г) пакінуць умоўна ў пляне Белсельбанку 150 тыс. руб. на пабудову ільназаводаў з тым, каб пытаньне пра будаўніцтва і тэрмін сканчэньня ільназаводаў вырашчэньня канчаткова пасьля разгляду будаўнічага праекту ільназаводаў Белсельтрэсту.

Канстатаваць недапускальнае невыкананьне Белсельтрэстам дырэктыў Эканамічнае Нарады аб прадстаўленьні пляну. Аб гэтым паставіць на від Белсельтрэсту і апублікаваць у прэсе.

Даручыць Дзяржпляну ў 2-хтыднёвы тэрмін разгледзіць і даць сваё заключэньне па прадстаўленьні Белсельсаюзам пляну на пабудову ільназаводу;

д) пакінуць умоўна ў пляне умоўна на гомельскі фруктовы завод 80 тыс. руб. і калі-ж да 1-га ліпеня г.г. Гомельскі АВК не падасьць задавальняючых тэхнічных пляноў, дык Белсельбанку прадставіць права скараціць гэтую суму да патрэбнай величыні.

Астатнія 50 тыс. руб. (з ліку нескарыстаных 130 тыс. руб.) з пляну выключыць.

Лічыць недапускальным непрадстаўленьне Гомельскім Акрвыканкомам тэхнічных пляноў (на прапанове Дзяржпляну) і запрапанаваць яму падаць іх у Дзяржплян да 1-га ліпеня г. г.

е) выключыць з пляну Белсельбанку крэдыт для Белсельсаюзу і Калгасэкцыі Белсельсаюзу ў суме 40 тыс. руб. на пабудову броварэў і крахмальных заводаў, з прычыны адсутнасьці каштарысаў.

Даручыць асабіста т. Аксючыцу паклясьці адміністрацыйнае спагнаньне на асоб вінаватых у непрадстаўленьні каштарысаў, зьвярнуўшы ўвагу на сваячасовае прадстаўленьне пляноў.

2. Сродкі ў суме 120 тыс. руб., якія аслабіваюцца ў выніку скарачэньня па паасобных артыкулах пляну Белсельбанку (азначаных у п. 1-м літ. „б", „в", „д" і „е" гэтае пастановы), накіраваць на мерапрыёмствы па ўзьмацненьню экспарту.

Даручыць НКГандлю на працягу тыдню падаць у Дзяржплян праект скарыстаньня памянёных сум.

3. З мэтаю ўнікненьня паралелізму і дасягненьня найвялікшай плянавасьці ў ажыцьцяўленьні мерапрыёмстваў па ўзмацненьню экспарту с.г. прадукцыі, усе крэдыты на гэтыя мэты павінны канцэнтравацца ў Белсельбанку, а таксама ўсе будаўнічыя пляны павінны ўзгаджацца Дзяржгандльбелам і НКЗемам і іншымі зацікаўленымі органамі.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры СНК БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай нарады БССР В. Крывіцкі.

11 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Экономического Совещания при Совете Народных Комисаров БССР

о сокращении кредитов Белсельбанка по некоторым мероприятиям, намеченным по плану производственного кредитования Белсельбанка и о передвижении этих кредитов на другие отрасли сельского хозяйства.

Заслушав заключение Президиума Государственной Плановой Комиссии, Экономическое Совещание при Совете Народных Комисаров БССР постановляет:

1. Отметить, что до настоящего времени по ряду мероприятий по индустриализации сельского хозяйства соответствующими организациями (Белсельтрест, Белсельсаюз и Гомельский Окружной Исполнительный Комитет) не представлены строительные планы и проекты, а в некоторых случаях отсутствуют даже заявки.

В связи с этим принять следующие предложения, касающиеся исполнения строительной части плана индустриализации сельского хозяйства и изменений в кредитном плане Белсельбанка:

а) принять к сведению сообщение представителя Белсельбанка, что до настоящего времени сельско-хозяйственная кооперация получила на молочное дело 260 тыс. руб., т. е. всю сумму, предусмотренную по плану (исключая кредиты для колхозов), каковая используется на оборудование разных заводов по переработке молока. Отмечая полное исполнение кредитно-финансового плана в этой отрасли,—предложить Белсельбанку до 1-го июля представить в Государственную Плановую Комиссию (копию в Белсельбанк) список товариществ, строящих молочные заводы, и показать в списке стоимость постройки каждого завода;

б) кредит в сумме 10 тыс. руб. на постройку яичных складов и птичьих холодильно-боен из плана Белсельбанка исключить в виду отсутствия соответственных заявок со стороны Белсельсоюза;

в) исключить из плана Белсельбанка кредит на постройку колбасной фабрики в сумме 20 т. р., ибо до сего времени нет плана на постройку так равно и заявок на средства от заинтересованных организаций;

г) оставить условно в плане Белсельбанка 150 тыс. руб. на постройку льнозаводов с тем, чтобы вопрос о строительстве и сроке окончания заводов разрешить окончательно после рассмотрения строительного проекта льнозаводов Белсельтреста.

Констатировать недопустимое невыполнение Белсельтрестом директив Экономического Совещания о представлении планов. Об этом поставить на вид Белсельтресту и опубликовать в прессе.

Поручить Государственной Плановой Комиссии в 2-х недельный срок рассмотреть и дать свое заключение по представлении Белсельсоюз, плана на постройку льнозавода;

д) оставить в плане условно на гомельский фруктовый завод 80 тыс. руб. и если до 1-го июля с. г. Гомельский Окружный Исполнительный Комитет не представит удовлетворительных технических планов, то Белсельбанку предоставить право сократить означенную сумму до необходимой величины.

Остальные 50 тыс. руб. (из числа неиспользованных 130 т. р.) из плана исключить.

Считать недопустимым непредставление Гомельским Окружным Исполнительным Комитетом технических планов (по предложению Госплана) и предложить ему представить их в Госплан до 1-го июля с. г.

е) Исключить из плана Белсельбанка кредит для Белсельсоюза и Колхозсекции Белсельсоюза в сумме 40 тыс. руб. на постройку винокуренных и крахмальных заводов, в виду отсутствия смет.

Поручить лично т. Аксючицу наложить административное взыскание на лиц виновных в непредставлении смет, обратив внимание на своевременное представление планов.

2. Средства в сумме 120 т. р., какие освобождаются в случае сокращения по отдельным статьям плана Белсельбанка (означенных в п. 1-м, лит. «б», «в», «д» и «е» этого постановления), направить на мероприятия по усилению экспорта.

Поручить НКТоргу в недельный срок представить в Государственную Плановую Комиссию проект использования упомянутых сумм.

3. Во избежание параллелизма и с целью достижения наивысшей плановости в осуществлении мероприятий по усилению экспорта с.-х. продукции, все кредиты на эти цели должны концентрироваться в Белсельбанке, а также все строительные планы согласовываться Белгосторгом с Наркомвемом и другими заинтересованными органами.

Председатель Экономического Совещания при СНК БССР М. Карклін.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономсовещания БССР В. Кривицкий.

11-го июня, 1928 г.
г. Менск.

ХРОНІКА.

У Галоўнавуцы БССР.

Удзел БССР ва Ўсесаюзным археолёгічным зьезьдзе.

У 1928-29 годзе ў Маскве адбудзецца Ўсесаюзны археолёгічны зьезд.

БССР прыме таксама ўдзел у гэтым зьезьдзе. Дзеля гэтага зараз пры Галоўнавуцы БССР арганізаван археолёгічны камітэт з мясцовых археолёгаў, гісторыкаў і музейных працаўнікоў у ліку 19 асоб.

Арганізацыя аддзяленьня Белдзяржбібліятэкі ў Магілеве.

Галоўнавука БССР намецілa в наступнага году адчыніць у Магілеве аддзяленьне Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі пры мясцовым музеі.

Фонд бібліятэкі будзе складаць звыш 80.000 навуковых кніг.

Удзел БССР у гістарычнай выстаўцы ў Бэрліне.

Навуковае таварыства «Ост-Эўропа" зараз арганізоўвае ў Бэрліне гістарычную выстаўку.

Галоўнавука БССР прыме ўдзел у гэтай выстаўцы. Ужо адпраўлены цэлы шэраг экспанатаў (кнігі па гістарычных і грамадзкіх дысцыплінах, дыяграмы і картаграмы і г. д.) якія характарызуюць пастаноўку навукова-дасьледчай справы ва ўстановах БССР.

Цікавыя матар'ялы па краязнаўству.

За апошні час сувязь паміж мясцовымі краязнаўчымі арганізацыямі і цэнтральным бюро краязнаўства значна палепшылася.

З месц атрымоўваюцца розныя матар'ялы па краязнаўству.

У красавіку месяцы Цэнтральнае Бюро краязнаўства атрымала ад Слуцкага раённага т-ва 150 песень рознага зьместу, запісаных у час краязнаўчай экскурсіі на „Князь-Возера"; т-на атрымала 83 песьні, запісаныя краязнаўчым гуртком 2-й мазырскай сямігодкі.

Апроч таго, атрымана ад краязнаўчага гуртку клімавіцкай 2-й сямігодкі (Магілеўская акруга) 125 вучнёўскіх спытакаў з розными фольклёрнымі матар'ялямі, запісаных вучнямі.

Гастролі тэатру „Современник"

З 3-га ліпеня пачне ў Менску ставіць свае пастаноўкі Маскоўскі тэатр „Современник".

У рэпэртуар гэтага тэатру ўваходзяць п'есы «Пушкін», «Ленін» і інш.

Усяго ў Менску тэатр дасьць 6 гастроляў.

Новыя стыпэндыі студэнцтву.

Ц.Б. Пралетэтуду распрацавала новы праэкт стыпэндый на 1928-29 навучальны год. Згодна гэтага праэкту для студэнтаў ВУЗ'аў вызначана стыпэндыя у 25 рублёў у месяц, для рабфакаў—28 рублёў, для тэхнікумаў Віцебску, Менску і Гомелю—20 рублёў, іншых гарадоў—18 рублёў.

Праэкт накіроўвае у адпаведныя інстанцыі для зацьверджаньня.

Новы парадак прыёму ў індустрыяльныя тэхнікумы.

Наркамасьветы даў на месцы ўказаньні аб тым, што асобы, скончыўшыя індустрыяльныя прафшколы, пры паступленьні ў індустрыяльныя тэхнікумы адпаведнай спэцыяльнасьці павінны будуць трымаць іспыты на альгебры і геометрыі, як і тыя, хто скончыў і школы сямігодкі. Раней-жа з прафшкол прымаліся вучні бяз іспытаў.

Аб выданьні дзіцячае газэты.

ЦК ЛКСМБ узьняў пытаньне перад адпаведнымі органамі аб арганізацыі новай дзіцячай газэты.

Мяркуецца газэту выпускаць 2 разы ў тыдзень, разьлічыўшы яе на 10—16-гадовы ўзрост.

Што датычыцца існуючага журналу «Беларускі піонэр», дык апошні будзе абслугоўваць дзяцей 8—12-гадовага ўзросту.

Дом адпачынку для батракоў.

У Воўчавічы з 1-га чэрвеня адчыніўся дом адпачынку для батракоў і сельска-гаспадарчых і лясных рабочых.

Усяго за летні сэзон гэты дом адпачынку мае прапусьціць 455 чал.

З гэтага ліку рабочым савецкіх гаспадарак прадстаўлена 50 проц., батракам, пракаваўшым на лесараспрацоўках і сплаве—40 проц. і лясной варце—10 проц.

Дом адпачынку будзе працаваць да 1 верасьня.

Пабудова кішэчнага заводу.

Белдзяржгандаль сёлета будзе будаваць кішэчны завод пры Менскай гарадзкой скотабойні. Праэкт заводу ўжо зацьверджаны і ўся пабудова будзе каштаваць 52.000 руб.

Разьмеркаваньне крэдытаў на жыльлёвае будаўніцтва.

Менскі акрвыканком зрабіў разьмеркаваньне крэдытаў на 1928 г. на жыльлёвае будаўніцтва па гарадох акругі. Водаўз разьмеркаваньня жаты гор. Менску атрымаюць 295.515 руб. крэдыту і г. Барысаву— 52110 руб.

Асыгнаваньні на культасьветпрацу.

На ўтрыманьне клюбаў і хат-чытальняў на савецкіх гаспадарках Белсельтрэсту асигнавана 5493 руб. Апрача таго Белсельтрэст адпусьціў 25 тысяч рублёў на утрыманьне рабочых савгасаў, якія камандыраваны для вучобы ў школы сельска-гаспадарчага вучнёўства.

Аб камандыроўцы Барсукова.

СНК дазволіў Народнаму Камісару Аховы Здароўя т. Барсукову навуковую камандыроўку за граніцу на $1^1/_2$ месяца.

Менскі дзень.

10.000 руб. адпушчана ў бюджэце Наркамадраву на рамонт цэнтральнай рабочай і прыватзальнай амбуляторый.

Пабудовы ціраў для беларускай дзівізіі пастаноўлены ўнесьці ў плян грамадзкіх работ Менскі гарсавет.

8.000 капілак новага фармату разьмеркавана касамі апчадпасьці БССР паміж актыўнымі ўкладчыкамі. Усяго-ж па БССР разьмеркавана каля 12.000 капілак.

Белрабсаюзным пастанавіла адпусьціць Рачыцкаму Цэрабкопу 10.000 руб. крэдыту на пабудову мэханічнай хлебапякарні.

344 чал. нарадзілася і 171 чал. памёрла за май месяц па г. Менску. За гэты-жа самы час адбылося 152 шлюбаў і 53 разводаў.

Замежную машыну атрымаў Беларускі саматужна-прамысловы саюз праз Управу Дзяржгандлю БССР для арцелі панчошнікаў. Устаноўка гэтай машыны дасьць магчымасьць павялічыць у 4-5 разоў прадукцыю. Чакаецца атрымаць яшчэ некалькі замежных машын для гэтай арцелі.

Фармацэўтычная лябараторыя Менскага аптэкаўпраўленьня аб'ядналася з фармацэўтычным заводам Белмедгандлю. Гэтае аб'яднаньне дасьць магчымасьць утаньніць выпускаемую прадукцыю.

5.000 рублёў на адпачынак для с.-г. і мясцовых рабочых.

ЦК саюзу сельгаслесрабочых асигнавала 5.000 рублёў з фонду палепшэньня быту рабочых на высылку членаў саюзу ў дамы адпачынку. Сродкі разьмеркаваны па акругах.

У шэрагі Аўтадору.

Магілеўскае Акраддзяленьне саюзу працасьветы ўступае ў пайшчыкі «Аўтадору» уносіць пай у суме 50 руб. і заклікае, па гэтаму прыкладу ўнесьці паі наступныя профарганізацыі гор. Магілеву:

Акрпрафбюро, саюз савгандальслужачых, сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, мэдсанпрацы, мэталістых, будаўнікоў, скурнікаў, дрэваапрацовачнікаў, харчавікоў, нарсувязі, чыгуначнікаў, расмасдору.

Рост краязнаўчых арганізацый па БССР.

Краязнаўчая праца на БССР усё больш і больш разгортваецца.

На 1-га студзеня 1928 г. усіх краязнаўчых арганізацый на БССР налічвалася 301, з гэтага ліку акруговых таварыстваў краязнаўсц ва—8, раённых—100, гурткоў па краязнаўству—96, школьных гурткоў і краязнаўчых т-ваў у ВНУ—97.

Лік членаў у гэтых краязнаўчых арганізацыях агулам павялічыўся з 9.367 да 10.510 чал. (павялічэньне на 12 проц.).

Трактары для калектыўных гаспадарак.

У бягучым месяцы Белсельсаюз атрымаў 16 трактараў, з іх 11 трактараў з Амэрыкі і 5 з Пуцілаўскага заводу.

Атрыманыя трактары будуць разьмеркаваны паміж калектыўнымі гаспадаркамі.

На будучы год Белсельсаюз мяркуе закупіць яшчэ 55 трактараў для калектыўных гаспадарак.

Літаратура ў вёску.

Інспэкцыя народнай асьветы сёлета пакіравана на раёнах 40 бібліятэчак. Бібліятэчкі ў 1000 кніжак атрымаў кожны нарадом і ў 800 кніжак—кожная апорная хата-чытальня. Сярод кніжак пераважнае месца займае папулярная літаратура па сельскай гаспадарцы.

Пабудова смалярных заводаў.

Сёлета ў Менскай акрузе будзе будавацца пяць новых смалакураных заводаў. Заводы будуць будавацца ў Бегомльскім, Бярэзінскім, Койданаўскім, Шацкім і Чэрвонскім раёнах. На пабудову адпушчана 25 тысяч рублёў.

Абслугоўваньне беспрацоўных.

Прэзыдыум ЦСПСБ вылучыў камісію з 7 асоб пад старшынствам тав. Кагана для абслугоўваньня беспрацоўных, якія заняты на грамадзкіх работах. Гэта камісія з'арганізавана для наладжваньня культурнай і тарыфна-эканамічнай работы.

СУД.

ХОЦЬ НЕ ЖАНІСЯ.

Працаваў у Какаўшчынскай школе, Горацкага р., Арш. акр. настаўнік Зьмітраў Яфрэм, а жонка яго жыла ў другім месцы. І вось спаткаўся ён з настаўніцай Паўлінаў Ніліпенка, спадабалася яна яму, а ён ёй, урэшце пажаніліся.

Аб тым, што Зьмітраў ужо мае адну жонку Паўліна ня ведала.

Жывуць сабе яны ціха, мірна, працуюць.

Нарэшце Паўліна даведалася, што ня муж мае другую жонку і плаціць ёй аліменты.

Не спадабалася Паўліне, што муж яе абманаў і падумала яна яму адмясьціць так, каб ён помніў да сьмерці.

Падрыхтавала належную зброю і спакойна лягла абое спаць.

Пазна ноччу яна прачнулася, разбудзіла мужа і ў гэты момант, крыкнуўшы „вось табе", схапіла брытву і шмарганула ею на той часьці цела, без якой мужчына і чалавекам амаль ня мае права лічыцца, адным словам адняла палавы член. Затым узяла атруту, якую яна нарыхтавала для сябе, і хацела яе выпіць.

Зьмітраў хоць і абліваўся кроўю, але змог выбіць шклянку з рук, Паўліна выбегала з хаты, а Зьмітраў упаў на ложак.

Справа гэта разглядалася ў народным судзе 2 вучастку Аршанскай акругі і Паўліна Зьмітрава прыгаворана да 2 год. пазбаўленьня волі.

Пасьля абвяшчэньня прысуду яна абамлела і ня прышоўшы да прытомнасьці праспала ў летаргічным сьне пэўны тыдзень.

Акруговы суд разглядаў гэту справу ў касацыйным парадку і прыказаў народнага суду адмяніў з перадачай на разгляд у новым складзе суду і адначасова прапанаваў ватаварыць пад Зьмітравай Паўлінай медычную экспэртызу для высьвятленьня яе псыхічнага становішча ў момант злачынства.

Ходзяць чуткі, што цырульнікі на Аршанчыне гэтым выпадкам задаволены, бо значная частка жанатых мужчын пазбавалі брытвы і ходзяць у цырульні.

К.

ПЯЦЬ ГОД ЗА АЛІМЭНТАМІ.

У маі месяцы 1923 г. Нарсуд 4 вуч. Горацкага павету, прысудзіў з гр. Тамашова ў карысьць гр. Бондаравай—на ўтрыманьне дзіцяці. Але Бондарава і да гэтага часу не атрымала ад Тамашова ніводнае капейкі, бо ўся справа з выкананьнем лістом вандравала па сьвеце без выкананьня. Пабывала справа ў міліцыі і ў судыканаўцаў, але ўсё бяз толку, ня гледзячы на тое, што ў справе ёсьць вопіс маемасьці Тамашова і што з гэтай маемасьці можна было ўзяць на ўтрыманьне дзіцяці хоць частку сродкаў. У адзнаго толькі судыканаўцы гор. Гомлю, справа з выканаўчым лістом пралежала адзін год і 8 месяцаў і тады даслана ў Аршанскі акруговы суд, у маі месяцы гэтага году.

У апошні час Аршанскі акруговы суд гэту ваздрушчую справу накіраваў Акруговаму пракурору для прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у такой доўгай цяганіне.

С.

Роля бульбы ў індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі.

Усім добра вядома, што бульба ва ўмовах нашае сельскае гаспадаркі ёсьць аснова. Яна зьяўляецца галоўным прадуктам харчаваньня селяніна, яго жывёлы і дае прыбытак ад збыту на бровар ці крахмальню. Вось таму плошча пад бульбай па БССР перавысіла 400000 дзесяцін. Аднак, гэта ўсё. Пры наліччы адпаведных сартоў, з якімі вялася вясупынная селекцыйная праца,—бульба ёсьць надзвычайна ўніверсальная і ўдзячная культура. A. Stormer (Kartoffelbau) кажа: «Вайна паказала вялікую залежнасьць харчаваньня Нямеччыны ад культуры бульбы і яе ўраджаяў. Бульба і прадукты яе надавычайна прыгодны для замены хлеба. Сушка бульбы асабліва мае значэньне для гэтага гэтаксама, як і для замены недахвату кармоў і ўраўнаважаньня хістаньняў ураджаяў. Як корм, бульба прыгодна для коняй. Для свінагадоўлі-ж у Нямеччыне яна—аснова.

Бульба павінна замяніць увоз хлеба і крахмалістых кармоў: ячменю, канюшыны і кукурузы. Большая частка ўраджаю, якая ідзе на замену хлеба і кармоў, павінна пераапрацоўвацца на сушыльных і крахмальных заводах, што выкліча неабходнасьць пашырэньня гэтага віду вытворчасьці і г. д.

Як шляхі да павышэньня ўраджаяў, Stormer бачыць у неперарыўнай селекцыі і рацыянальным вядзеньні культуры бульбы.

Пэрспэктыва культуры бульбы ў нас на Беларусі на меншая, чым у Нямеччыне. Умовы для разьвіцьця і пашырэньня ў нас—бязмоўныя, аб гэтым сьведчаць высокія ўраджаі чыстых і здаровых сартоў і толькі неабходна наладзіць бульбяную насеннаводную працу і кантроль за насевамі.

Якім шляхам павінна пайсьці бульбяная прамысловасьць.

Перш за ўсё неабходна рацыяналізаваць нашу ўжо існуючую бульбяную вытворчасьць, даючы кожнай яе галіне адпаведны сорт, наладзіўшы ўмелае скарыстаньне адкідаў, вынізіўшы сабекошт і г. д. Дзеля гэтага неабходна правесьці абсьледаваньне заводаў і сыр'явое базы. Падругое, неабходна будаваць новыя заводы па пераапрацоўцы бульбы ў т. зн. хлоп'і і шыцаль (сушыльні) у патаку, сагу, дэкстрын, клей і г. д. Дзеля гэтага нашы гаспадарчыя ўстановы павінны зацікавіцца і дапамагчы матар'яльна інстытуту імя Леніна ў пабудове тэхналёгічнае лябараторыі, якая знайшла-б шляхі рацыяналізацыі ўжо існуючых заводаў, а роўна і адшукала-б новыя шэрагі пераапрацоўкі бульбы ў патрэбныя для нас прадукты.

Думаецца, што сьвінагадоўля ў нашай прамысловасьці зойме далёка не апошняе месца і аснова сьвінагадоўлі павінна грунтавацца на бульбе, але, бязумоўна, не на сырой, а пераапрацованай у тым-ж хлоп'і—сушаная бульба. Яна надавычайна адрозьніваецца ад сырое і наближаецца да аўса, ячменю і кукурузы.

Хімічны склад сухое бульбы і хлоп'ю ў параўнаньні з аўсом і кукурузай.

	Бялок у % %	Жыр у % %	Безазот. экстр. матэрый у % %
Сушаная бульба	6,4	0,2	70,3
Хлоп'і . . .	6,3	0,2	74,2
Кукуруза . .	10,1	4,7	68,6
Авёс. . .	8,5	4,0	62,8

Як бачым з табліцы, карковая якасьць іх, можна сказаць, роўнацэнная. Перапрацоўваецца сухая бульба і хлоп'і добра і пры належнай сушцы пазбаўляе страт ад загніваньня, захоўваючыся да васьмі год, становячыся добра транспартабельнай. Значэньне-ж сухое бульбы для насельніцтва відавочнае.

Каб будаваць завод па пераапрацоўцы бульбы ў хлоп'і, трэба раней усяго даведацца—якімі мэтадамі і як рацыянальней гэту ідэю ажыцьвіць? На гэта павінен даць адказ Беларускі Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна, якому належыць прыступіць да арганізацыі тэхналёгічнае лябараторыі і адшукаць гэтыя мэтады.

Хлоп'і і мука з бульбы могуць быць скарыстаны і на харч для людзей, ідучы на прыгатаваньне стравы з яе выключна, ці як прыбаўка (да 50 процантаў) пры выпечцы хлеба.

У харчовай прамысловасьці немалое значэньне мела-б гэтак сама пераапрацоўка крахмалу ў патаку тут-жа ў БССР і бульбы — у сагу. Сага (бульбяныя крупы) вельмі страўная, лёгка варыцца. Асабліва каштоўна яна на вайне і ў галодныя гады.

Сьпірытусам з бульбы трэба навучыцца рухаць нашы аўто і г. д. Вось які ў кароткіх рысах шлях індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі ў межах аднае культуры бульбы.

М. Д.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1 «Два» Анатолі Вольны. Аповесьць, выданьне другое.

Стар. 89, цана 50 кап.

2. „Пагаспадарку" Н. Дарафеў і М. Палікарпаў. Апавяданьні, пераклад Э. Маеўскага. Стар. 30, цана 15 кап.

3. „Пажарнікі". Я. Купалы, пераклад з польскай мовы. Малюнкі А. Абрамава. Цана 25 кап. Для дзяцей.

4. «Літаратурная хрыстаматыя» Г. Ябраў. Частка першая. Стар. 281, цана 1 руб. 75 к. (на ўраўскай мове).

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 17-VI 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—59,5, куп. 4—57,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—08,5 куп. 5—06,5

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5 куп. 5—01,5

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—66, куп. 25—56.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120—50, куп. 118—50.

Абл. 12 проц. паз.—прад. 100—67, куп. 100—60.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—67, куп. 24—57.

Што слухаць па радыё.

20-га чэрвеня—серада.

7—00— 7—30 Гутарка ўрача «Як уберагчы дзяцей улетку ад хваробы».
7—30— 8—10 Беларуская радыёгазэта.
8—10— 8—40 Права сярод бедноты.
8—40— 9—10
9—10—11—00 Мастацкая перадача.

22-га чэрвеня—пятніца.

7—00— 7—30 Гутарка Аўтадору.
7—30— 8—10 Беларуская радыёгазэта.
8—10— 8—40 Гутарка агранома «Аб мэханізацыі сельскае гаспадаркі; гутарка вэтэрынара.
8—40— 9—10 Гутарка МОПР'у.
9—10—11—00 Мастацкая перадача.

23-га чэрвеня—субота.

7—00— 7—30 Беларускі піонэр.
7—30— 8—10 Беларуская радыёгазэта.
8—10— 8—40 Новае ў зямельных справах (Гутарка ад Наркамзему).
8—40— 9—10 Нац. праца ў прафсаюзах.
9—10—11—00 Мастацкая перадача.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня 19-VI—роўна а 7-ай гадз. увечары адбудзецца зачынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	З аўторка, 19 чэрвеня грандыёзны фільм „Лішнія людзі" Пастаноўка рэжысэра Разумнага. Пачатак а 8 гадзіне.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка, 19 чэрвеня нямецкі мастацкі фільм „ПРАКУРОР ЮРДАН" ў 7 частках. Пачатак а 7 гадз. 15 хвілін.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З аўторка, 19 чэрвеня „СЫНАБАР" у 3-х сэрыях. Дзьве сэрыі (13 частак) у адзін сэанс.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З аўторка 19 чэрвеня „КАХАНЬНЕ Ў 16 год" Чарговая пастаноўка: «КАР'ЕРА ТАНЦОРКІ».

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР

падае да агульнага ведама, што 9 чэрвеня 1928 г. ім унесены, у адпаведнасьці з палажэньнем аб Дзяржаўных Прамысловых Трэстах, абвешчаным у С. З. СССР за 27 г. № 39 арт. 392 у другі падзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) пад № 7 наступныя зьмены статуту Трэсту пад назвай

„ВІЦЕБСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА".

Назва—Віцебская Дзяржаўная Акулярная Фабрыка Імя Розы Люксэмбург.

Мэта—вырабу і збыт па ўсім СССР акуляраў.

Новы статут зацьверджан пратаколам Прэзыдыуму ВСНГ БССР ад 16 сакавік 1928 г. за № 26 п. 267.

Статутны капітал вызначан у 275.000 руб.

Сэкратар НКГандлю БССР ВЕРАМЕЙЧЫК.

ДА ЎСІХ НАШЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ.

ІДУЧЫ У ВОДПУСК ЦІ НА КАНІКУЛЫ, ПАВЕДАМІЦЕ ў кантору ваш новы адрас і вам будзе накіравана газэта па новаму адрасу.

Пры перамене адрасу паведамляйце ваш стары адрас, праз каго здадзена падпіска і па які тэрмін.

Бяз гэтых вестак перамена адрасу РАБІЦЦА НЯ БУДЗЕ.

КАНТОРА.

АБВЕСТКА.

Даводзіцца да ведама ўстаноў, прадпрыёмстваў і грамадзян гор. Менску,

што па падставе заключонага дагавору з Камгасам, забараняецца без дазволу Белдзяржкіно расклейваць якія-б то ні было афішы, плякаты, выстаўляць шчыты, раздаваць лятучкі, вывешваць палотнішчы праз вуліцу і выпускаць іншага віду рэкляму.

За ўсякую выпушчаную рэкляму без дазволу Белдзяржкіно вінаватыя будуць прадпрыняцца да адказнасьці і да двайной аплаты па тарыфу.

БЕЛДЗЯЖКІНО.

НЕ ПАЗЬНІЦЕСЯ З ПАДПІСКАЙ НА 2-ое ПАЎГОДЗЬДЗЕ

на самую папулярную распаўсюджаную беларускую ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Орган Ц. В. К. Б. С. С. Р.

ЧАТЫРЫ РАЗЫ Ў МЕСЯЦ РАЗАМ З ГАЗЭТАЙ ПАДПІСЧЫКАМ РАССЫЛАЮЦЦА БЯСПЛАТНА ДАДАТКІ.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА

На 1 месяц	— 90 к.	На 3 м-цы	2 р. 70 к.
„ 2 м-цы	1 р. 80 к.	„ 6 м-цаў	4 р. — к.
На год	8 р. — к.		

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты пог вуліц Ленінскай і К. Маркса; у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ

ПРИ Ц. К. С. Б.

— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —

Поступать на курсы можно в любой месяц года.

Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.

ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.

Плата за первый месяц—5 руб, а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.

Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки обращаться: Минск, Всекобанк.

Народны суд 10 вуч. Аршанскай акругі выклікае на 15 жніўня к 10 гадзінам раніцы ў камару суду, якая знаходзіцца ў м-ку Кохавава, гр-ва

ЛУКАШЭВІЧА ТРАХІМА ВАСІЛЁВАГА

34 год, земляроба, які раней жыў у вёсцы Астрашанкі, Перавалоцкага с-с. Кохаваўскага раёну, Аршанскай акругі. У выпадку яго ня ўкі Вашай у суд паведаміць аб сваім месцазнаходжаньні а таксама просьба асоб якія ведаюць аб месцы нахаджэньні Лукашэвіча